ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 32 (1981)
20 красавіка 1965 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

22 КРАСАВІКА—95 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Ул. І. ЛЕНІНА

С. ГУЕЦКІ. «Смольны 1917 г.»

НАТХНЯЮЧЫ ВОБРАЗ

У Палацы культуры завода «Гомсельмаш» адбыўся вялікі вечар на тэму «Ленін у літаратуры і мастацтве». Уважліва слухалі рабочыя і інжынеры завода выступленне супрацоўніцы абласной бібліятэкі імя Ул. І. Леніна Аксаны Капуснікавай. Удзельнікам вечара быў паказаны мастацкі фільм «Ленін у Кастрычніку».

Вялікую аўдыторыю сабраў і вечар, прысвечаны тэме «Ул. І. Ленін у кінамастацтве». З расказам пра фільмы, у якіх адлюстраваны вобраз Уладзіміра Ільіча, перад камбайнабудаўнікамі выступіў мастацтвазнаўца Г. Ратнікаў.

В. СЯМЁНАЎ.

СУСТРЭЧА Ў ЦЭХУ

У абедзенны перапынак да рабочых ліцейнага цэха № 2 Мінскага аўтазавода прыйшоў народны артыст СССР П. Малчанаў. Ён расказаў пра сваю шматгадовую працу над вобразам Леніна ў сцэнічным мастацтве, а потым прачытаў маналог Ільіча з п'есы «Чалавек з ружжом».

Шмат цікавых мерапрыемстваў да гадавіны Леніна праводзіцца і на іншых прадпрыемствах Мінска. Так, на камвольным камбінаце адбыліся цікавыя сустрэчы са старымі камуністамі. Нядаўна тут сваімі ўспамінамі падзяліліся з моладдзю члены старой бальшавіцкай гвардыі т.т. Мар'ясіна і Валуеў.

ПРА РОДНАГА ІЛЬІЧА

Вечар, прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння Леніна адбыўся ў Добрушскім Доме культуры. З дакладам «Ул. І. Ленін — заснавальнік Савецкай дзяржавы» выступіла работнік аддзела культуры Ала Сініцкая. Пра свае сустрэчы з Ільічом расказаў прысутным удзельнік штурму Зімняга палаца Пётр Дарафеевіч Марозаў.

Затым удзельнікі вечара праслухалі лекцыю-канцэрт «Музыка ў жыцці Леніна». Артысты Беларускай дзяржаўнай філармоніі Г. Балецкая, А. Валошын, А. Купрыянава, Е. Эфрон выканалі творы, якія падабаліся Ільічу, або выконваліся ім у юнацкія гады.

П. СКАЧКОЎ.

ІСКРЫ ВЕЧНАЙ ЛЮБВІ

Калі пераступаеш парог гэтага пакоя, сэрца поўніцца пачуццём удзячнасці і глыбокай павагі да імя і спраў Ільіча. Гэта школьны музей Уладзіміра Ільіча Леніна. Існуе ён у Ільічоўскай сярэдняй школе два гады. Спачатку стварылі савет музея з 25 чалавек. У яго склад увайшлі лепшыя піянеры і камсамольцы. Тых матэрыялаў, што былі ў школе, для адкрыцця музея было недастаткова. Педагогі і вучні вырашылі звярнуцца за дапамогаю ў савецкія і зарубежныя музеі Леніна, да людзей, якія асабіста ведалі Уладзіміра Ільіча і працавалі разам з ім.

Школьнікі напісалі А. Стасавай, Е. Краўчанка, А. Андрэеву і іншым старым бальшавікам, напісалі не толькі пра сваю задуму, але і пра свае поспехі ў вучобе, пра жаданне навучыцца жыць і працаваць па-ленінску.

Колькі было радасці і хвалявання, калі напярэдадні новага, 1963 года ў школу прыйшоў першы адказ. Яго прыслала Алена Дзмітраўна Стасава. Яна пісала:

«Жадаю Вам добра падрыхтавацца да адкрыцця ленінскага музея і каб гэты музей у хуткім часе стаў для ўсёй школы цэнтрам па вывучэнню жыцця і дзейнасці Уладзіміра Ільіча. Вучыцца жыць і працаваць па-ленінску — вось які дзвіз павінны паставіць перад сабою ўсе юныя піянеры.

Ахвотна буду перапісвацца з Вамі, у меру сваіх сіл памагаць ва ўсім, што будзе неабходна правесці з маім удзелам».

Разам з пісьмом Алена Дзмітраўна прыслала свае ўспаміны аб Леніне, у якіх Уладзімір Ільіч паказаны як вялікі арганізатар і кіраўнік Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, як чалавек вялікай сціпласці, просты, уважлівы і чулы да людзей.

Цёплыя пісьмы і каштоўныя матэрыялы пра Уладзіміра Ільіча прыслалі для музея член КПСС з 1903 года Е. Краўчанка, саратнік Леніна А. Андрэеў і іншыя.

Праз некаторы час прыйшлі пасылкі з-за мяжы: з Парыжа, Лондана, Прагі, Браціславы, Варшавы, Кракава, Лейпцыга і іншых гарадоў свету. Усе хацелі памагчы школьнікам.

«Дарагія таварышы! — пісаў генеральны сакратар Камуністычнай партыі Францыі Марыс Тарэз. — Горача дзякую Вам за пісьмо, якое Вы мне накіравалі. У адказ на выказанае Вамі ў гэтым пісьме пажаданне пасылаецца Вам пры гэтым некалькі фатаграфій музея Леніна ў Парыжы, а таксама твор Леніна, выдадзены ў Францыі. Жадаю Вам вялікіх поспехаў у вашай вучобе і вашай дзейнасці і выказваю Вам, а таксама Вашым бацькам і выхавацелям братнія пачуцці».

А старшыня бібліятэкі памяці Маркса ў Лондане А. Ратштэйн з горыччу расказаў дзецям у сваім пісьме пра тое, што ў Лондане няма яшчэ музея Леніна, а домік, у якім жыў Ільіч з Надзеждай Канстанцінаўнай Крупскай, разбураны фашысцкай бомбай у гады другой сусветнай вайны. Ён паведамляў, што ў 1954 годзе памёр наборшчык Том Квелч, які «добра помніў, як у друкарню прыходзіў для работы над «Искрой» малады чалавек з рыжай бародкаю — Ленін».

Шмат рэдкіх матэрыялаў было атрымана з айчынных музеяў. Свае пісьмы, вершы, карціны, альбомы, кнігі прыслалі В. Гаганава, паэт М. Ісакоўскі, мастак М. Жукаў, былыя выпускнікі школы, а цяпер ударнікі камуністычнай працы.

У музеі дзеці сустракаюцца са старымі камуністамі, праводзяць гутаркі аб Леніне. Тут праходзяць урокі па грамадазнаўству, гісторыі, літаратуры, мове.

Можна з упэўненасцю сказаць, што Ленінскі музей Ільічоўскай школы адзін з лепшых у рэспубліцы. Ён узнагароджаны граматай ЦК ЛКСМ Беларусі і Рагачоўскага парткома. Яго ўжо ведаюць далёка за межамі Беларусі. Сюды прыязджалі госці з суседніх братніх рэспублік. І ўсе яны былі ў захапленні ад яго экспанатаў, ад цікавай ідэйна-выхаваўчай работы, якую праводзяць педагогі з дзецьмі.

Нядаўна рашэннем Рагачоўскага райвыканкома музей Ільічоўскай школы перайменаваны ў Народны музей Уладзіміра Ільіча Леніна.

Ф. СОБАЛЬ.

Гомельская вобласць.

УСПАМІНЫ СТАРЫХ КАМУНІСТАЎ

Часта сустракаюцца з моладдзю старыя камуністы Брэстчыны П. Гулаў і А. Казлоўпаў. Ім ёсць пра што расказаць малодшаму пакаленню.

Павел Мартынавіч Гулаў быў на прыёме ў Ул. І. Леніна як старшыня Вяземскага павятовага камітэта. Уладзімір Ільіч, успамінае стары камуніст, вельмі цікавіўся становішчам на месцах, настроямі людзей, іх клопатамі і стараўся ім дапамагчы, чым толькі мог.

Аляксандр Кандратавіч Казлоўцаў у гады рэвалюцыі служыў у ахове Маскоўскага Крамля. Уладзімір Ільіч іншы раз заходзіў у каравульнае памяшканне, расказвае А. Казлоўцаў. Леніну вельмі падабалася страявая песня байцоў аховы, і яны заўсёды спявалі яе, праходзячы ля вокнаў, за якімі жыў і працаваў Ільіч.

На многіх прадпрыемствах, у навучальных установах Брэста праходзяць сустрэчы з ветэранамі партыі, праводзяцца традыцыйныя ленінскія чытанні. Тысячы людзей слухаюць запісаны на грамафонных пласцінках голас Леніна.

Шмат брэстаўчан наведваюць прысвечаныя гадавіне з дня нараджэння правадыра ілюстраваныя выстаўкі «З Леніным у сэрцы», «Ул. І. Ленін — правадыр, таварыш, чалавек» у Доме палітычнай асветы.

ПАДАРУНАК ЧАЛАВЕЦТВУ

У вясны, якая прыносіць, як заўсёды, людзям адчуванне навізны жыцця, ёсць сёлета асаблівы падарунак, значэнне якога, можа быць, мы ацэнім не адразу. Я гавару пра сотні новых для нас твораў Ул. І. Леніна, якія становяцца вядомыя ўсяму свету ў гэтыя месяцы сёлетняга года. Па самым цвярозым падліку, без патэтычнага веснавога перабольшання — гэта каштоўны падарунак чалавецтву. Багацці гэтыя знаходзяцца ў тамах Поўнага збору твораў Ул. І. Леніна, выпуск якога завяршаецца сёлета Інстытутам марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС.

Поўны збор твораў. Каля дзевяці тысяч ленінскіх дакументаў. З іх звыш тысячы друкуецца ўпершыню, каля пяці тысяч не уваходзілі ў чатыры папярэднія выданні, а публікаваліся ў спецыяльных зборніках, перыядычным друку і таксама па сутнасці толькі цяпер становяцца даступнымі шырокаму чытачу.

Пяцьдзесят пяць тамоў! А ў кожным ад 500 да 800 старонак. Яшчэ ў дні хваробы Уладзіміра Ільіча Маякоўскі пісаў: «Вечно будет тысячестраницый грохотать набатный ленинский язык». Жывуць і заклікаюць цяпер ужо дзесяткі тысяч ленінскіх старонак.

Спатрэбілася шматгадовая праца многіх людзей, якія збіралі і падрыхтоўвалі да друку ўсё тое, што пакінуў чалавецтву Ул. І. Ленін. Пасля XX з'езда КПСС па-сапраўднаму ажыццявілася рашэнне XIII з'езда партыі, прынятае хутка пасля смерці вялікага правадыра рэвалюцыі: «Першай і галоўнай задачай інстытута XIII з'езд лічыць цалкам чавуковае і самае дэталёвае выданне Поўнага збору твораў Ул. І. Леніна». Доўгія гады рашэнне гэтае не выконвалася.

І гэты вынік культу асобы партыя ліквідавала. 8 студзеня 1957 года ЦК КПСС прыняў рашэнне, у якім адзначыў, што 4-е выданне Твораў Ул. І. Леніна не з'яўляецца поўным, і палічыў неабходным «сабраць разам усю ленінскую літаратурную спадчыну і выпусціць у свет поўны збор усіх твораў Ул. І. Леніна». ЦК асобна ўказаў на тое, што «увесь даведачны апарат павінен мець строга навуковы характар і памагаць чытачам у вывучэнні прац Ул. І. Леніна». Усе наступныя гады ЦК КПСС штодзённа сачыў за ходам выдання Поўнага збору, кіраваў гэтай работай, памагаў супрацоўнікам Інстытута марксізма-ленінізма ў пошуках новых дакументаў, у даследчай рабоце. Гаворка ішла пра нашу самую магутную ідэйную зброю, і ЦК паклапаціўся, каб увесь арсенал духоўнай спадчыны Ул. І. Леніна стаў даступны партыі і народу.

За гады рэвалюцыі творы Ул. І. Леніна на мовах народаў СССР былі выдадзены грандыёзным тыражом— звыш 300 мільёнаў экземпляраў. Па статыстыцы ЮНЕСКО, Ул. І. Ленін стаіць на першым месцы сярод аўтараў свету па колькасці перакладаў на замежныя мовы.

У ветэранаў Інстытута марксізма-ленінізма разуменне таго, што яны працуюць для гісторыі, для чалавецтва, адкрываючы радок за радком, артыкул за артыкулам думкі Ул. І. Леніна, нарадзілася даўно — у гады, калі яны слухалі жывога Ільіча, працавалі блізка ля яго. Друкуючы ў 1921 годзе матэрыялы Ул. І. Леніна, машыністка Саўнаркома Лізавета Сямёнаўна Голубева пераконвалася на практыцы, якое значэнне для краіны, для перамогі справы рэвалюцыі мае кожнае слова Уладзіміра Ільіча. І праз дзесяцігоддзі Л. Голубева, цяпер ужо навуковы супрацоўнік інстытута, вывучаючы даўнія рукапісы, адчувае тую ж неабходнасць паказаць свету тэкст Леніна слова ў слова, літара ў літару, бо ленінскія думкі паранейшаму патрэбны людзям — і як зыходны пункт для тэарэтычных разважанняў, і як самая сучасная практычная парада. Іх многа, твораў Леніна, якія сталі вядомыя дзякуючы цудоўнаму майстэрству Л. Голубевай, яе інтуіцыі пры вывучэнні самых неразборлівых, амаль зашыфраваных рукапісаў Леніна, інтуіцыі, якая народжана вялікім вопытам і гарачым сэрцам.

У моладзі інстытута тая ж любоў да Леніна, што і ў ветэранаў, і, вядома, уласцівая маладосці рашучасць пошукаў.

Адчуванне святочнасці работы не пакідае людзей, занятых выданнем Ул. І. Леніна, пры стварэнні навукова-даведачнага апарата. І тут на кожным кроку пошукі, а часам і адкрыцці.

Каб напісаць некалькі радкоў заўвагі, якая тлумачыць сэнс успамінаемай Леніным падзеі або факта, сучаснаму чытачу невядомага, патрэбна іншы раз праца многіх дзён. Заўваг у кожным томе дзесяткі, іншы раз — сотні. Але ж яны памагаюць мільёнам людзей лепш зразумець кожную думку Уладзіміра Ільіча, мець асалоду ад яго бліскучага аналізу фактаў, умення бачыць у кожнай з'яве яго глыбінную сутнасць. І складанне заўваг становіцца творчай, хвалюючай работай.

У першых 45 тамах Поўнага збору прыведзены спісы каля 15 тысяч друкаваных работ, успомненых Ул. І. Леніным. Каб вызначыць, якімі іменна крыніцамі карыстаўся Уладзімір Ільіч, супрацоўнікам інстытута трэба было вывучыць літаральна акіян літаратуры — бібліятэкі кніг, шматгадовыя камплекты газет і часопісаў на 20 мовах.

Перад падрыхтоўшчыкамі Поўнага збору пастаўлена задача — паведаміць чытачу звесткі пра кожнае імя, успомненае Ул. І. Леніным. Імёнаў тысячы, сярод іх маса невядомых. Дае, напрыклад, Ул. І. Ленін у ліпені 1918 года тэлеграму, у якой дзякуе камісару станцыі Орша Івашчанку. Работнікі інстытута запытваюць партыйныя арганізацыі Оршы, Брэста, Мінска, Маладзечна, Смаленска. Нідзе няма звестак пра камісара Івашчанку. Але высвятляецца кола людзей, якія працавалі ў Оршы ў 1918 годзе. Пісьмы, тэлеграмы, гуткі па тэлефоне. І вось, нарэшце, пісьмо ў адказ з Разані ад старога бальшавіка А. Позняка: камісарам Оршы быў летам 1918 года Д. Івашчанка, яго сям'я жыве ў Маскве.

Сунімаючы хваляванне, супрацоўнік інстытута адпраўляецца па ўказаным адрасе. Так, шматмесячныя пошукі паспяхова завершаны: копія тэлеграмы Ул. І. Леніна захоўваецца, як самая каштоўная рэліквія ў сям'і былога камісара. У 50-м томе паяўляецца некалькі радкоў пра Д. Івашчанку.

У 45-м томе змяшчаецца запіска Ул. І. Леніна ў Кіраўніцтва справамі Саўнаркома, у якой ён просіць перавесці ў лепшыя жыллёвыя ўмовы «тав. Калеснікаву — жонку расстралянага таварыша». У томе даецца зноска—гаворка ідзе пра жонку аднаго з расстраляных англійскімі інтэрвентамі 26-ці бакінскіх камісараў— камісара працы Якава Давідавіча Зевіна. А ў «Паказальніку імёнаў» паведамляецца, што Надзежда Мікалаеўна Калеснікава, якая летась памерла, сама была ў свой час бакінскім камісарам асветы. Але ў заўвагах не гаворыцца, вядома, пра такі факт, які, думаю, зацікавіць чытачоў: вялікую работу па падрыхтоўцы Поўнага збору твораў Ул. І. Леніна правёў і працягвае весці сын Я. Зевіна і Н. Калеснікавай, загадчык сектара твораў Ул. І. Леніна ў Інстытуце марксізма-ленінізма — доктар гістарычных навук Уладзімір Якаўлевіч Зевін.

У гэтым сектары ёсць група біяграфічнай хронікі. Яе мэта, у ідэале, не па днях, а па гадзінах аднаўляць падзеі ленінскага жыцця. Група рыхтуе шматтомнае выданне — «Біяграфічную хроніку Ул. І. Леніна». Самыя галоўныя падзеі будучай «Хронікі» друкуюцца ў тамах Поўнага збору ў раздзеле «Даты жыцця і дзейнасці Ул. І. Леніна». Ад скупых радкоў раздзела з іх пераканальнасцю строга акрэсленых часам фактаў у чытача ўзнікае адчуванне надзвычайнай сканцэнтраванасці ленінскага жыцця, фантастычнай па сваёй насычанасці і маштабнасці дзейнасці генія рэвалюцыі.

Збіранне ленінскіх работ працягваецца. Зусім нядаўна невядомыя пісьмы Ул. І. Леніна прывезла з-за рубяжа брыгада інстытута. Трэба думаць, што да 55 тамоў выдання, якое завяршаецца, далучацца ў свой час дадатковыя тамы нанава адшуканых ленінскіх матэрыялаў — бо колькі яшчэ існуе невядомых нам артыкулаў, пісем, дакументаў, напісаных Ул. І. Ленінам!

Рэвалюцыйны народ не можа не адчуваць вострай патрэбы ўзяць на ўзбраенне ўсё тое, што пакінулі яму яго вялікія настаўнікі. Вось чаму мы так чакаем вестак з горада Леніна, дзе друкуюцца цяпер апошнія тамы ленінскага Поўнага збору твораў. У бібліятэках, чытальных залах, у дамах людзі схіляюцца над запаветнымі старонкамі, шукаюць адказу, раяцца, узбройваюцца, вучацца разумець жыццё і ператвараць яго ў імя чалавечага шчасця.

Ілья АГРАНОЎСКІ.
(АДН).

АБ ВЯЛІКІМ ПОДЗВІГУ

«Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне», «Героі не паміраюць», «Подзвігі юных» — такія літаратурныя выстаўкі можна ўбачыць у Магілёўскай гарадской бібліятэцы імя Карла Маркса.

На кніжных паліцах выдзелены раздзелы «Па дарогах вайны», «Ветэраны баёў расказваюць», дзе сабраны дакументальныя зборнікі, кнігі пісьменнікаў, журналістаў, былых воінаў, афіцэраў і палкаводцаў.

Работнікі бібліятэкі склалі картатэку літаратуры «Да 20-годдзя з дня вялікай перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй». Каталожныя картачкі адлюстроўваюць шматлікія нарысы, артыкулы, што змешчаны ў перыядычным друку. Усе гэтыя газетныя і часопісныя матэрыялы аб баявых подзвігах людзей вобласці збіраюцца ў папкі «Героі нашага краю», «Магілёўскія народныя мсціўцы».

На многіх прадпрыемствах горада бібліятэка праводзіць бібліяграфічныя агляды твораў літаратуры на ваенную тэму.

Нядаўна на трыкатажнай фабрыцы чытачы пазнаёміліся з кнігамі пра мужнасць юных абаронцаў нашай Радзімы.

НА РУБЯЖАХ СЯМІГОДКІ

Паспяхова нясе працоўную перадмайскую вахту на будаўніцтве Гомельскага суперфасфатнага завода электразваршчык Аляксей Грэсь. На мантажы хваладзільнікаў комплексу сернакіслотнай вытворчасці ён штодзённа выконвае да паўтары зменных нормы.

На здымку — электразваршчык Аляксей Грэсь.

Фота Ч. МЕЗІНА. (БЕЛТА).

ГАРТАЮЧЫ ДЭКАДНЫ БЛАКНОТ

АРКЕСТРЫ. ІХ ШЛЯХІ-ДАРОГІ

А. МАЙЗЛЕР,
заслужаны артыст БССР

□

НАШЫ аматарскія сімфанічныя аркестры, якія існуюць на базе музычных навучальных устаноў і працуюць на грамадскіх асновах, робяць вялікую і важную справу — прапагандуюць музычную культуру сярод шырокіх мас слухачоў. Гэта тым больш важна, калі ўлічыць, што ў Беларусі пакуль што ёсць толькі адзін «штатны» прафесіянальны сімфанічны аркестр, а ў абласцях такіх аркестраў наогул няма.

Вопыт сімфанічнага аркестра Палаца культуры прафсаюзаў (Мінск), Магілёўскага і Брэсцкага сімфанічных аркестраў у гэтых адносінах вельмі павучальны, а самаадданая работа іх кіраўнікоў—Л. Саламоніка, М. Салдатава, М. Солапава, М. Мінстара можа служыць прыкладам многім работнікам культуры.

Гэтыя сімфанічныя аркестры прадэманстравалі на Дэкадзе высокі ўзровень майстэрства. Асабліва хочацца адзначыць народны сімфанічны аркестр Палаца культуры прафсаюзаў, які, у садружнасці з народнай харавой капэлай Палаца, упершыню ў гісторыі самадзейнага мастацтва Беларусі выканаў кантату «Горад юнацтва» (музыка Ю. Семянякі, словы А. Бачылы). Пры ўдзеле гэтага ж аркестра была пастаўлена і опера Вердзі «Рыгалета».

Народны сімфанічны аркестр Палаца культуры прафсаюзаў гучаў даволі стройна. Дырыжор Л. Саламонік дамогся роўных суадносін у гучанні аркестравых груп, хору і голасу салісткі. Аднак у аркестры не заўсёды захоўвалася чысціня інтанацый як у духавых, так і ў струнных інструментах, у радзе выпадкаў аркестр гучаў «жорстка», яму не хапала пявучасці.

Найбольшае ўражанне пакінула выступленне сімфанічнага аркестра Магілёва (мастацкі кіраўнік і дырыжор М. Салдатаў). Гэта сапраўды прафесіянальны калектыў з вялікімі тэхнічнымі магчымасцямі, з вельмі добрай струннай групай. У яго праграме былі два творы: тэхнічна складаны і эфектны фінал Чацвёртай сімфоніі Чайкоўскага і сімфанічная карціна грузінскага кампазітара Лагідзе «Сачыдао». Абодва творы аркестр сыграў з добрым густам, чыста і эмацыянальна, з вялікім уздымам і тэмпераментам.

У канцэрце выступіў з асобным нумарам ансамбль скрыпачоў. Пад кіраўніцтвам канцэртмайстра аркестра С. Салдатавай 17 скрыпачоў паказалі высокую выканаўчую культуру.

Вялікую і разнастайную праграму прапанаваў Брэсцкі гарадскі сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам М. Солапава і М. Мінстара. Аркестр гучаў сакавіта, добрым строем вызначалася струнная група. Мякка і чула акампаніраваў аркестр чатыром салістам-спевакам.

Віцебскі аркестр выканаў «Уверцюру» С. Рабунскага. Гэта кароткі, вельмі лаканічны твор. У ім няма ніякага сімфанічнага развіцця, яго хутчэй можна было б назваць музычным эпіграфам канцэрта, чым уверцюраю. Але і маленькі нескладаны твор аркестр сыграў неахайна.

І тут, мне здаецца, трэба пагаварыць пра стабільнасць у рабоце сімфанічнага аркестра. Мы рашуча выступаем супраць «паказухі», супраць стварэння «аднадзённых» калектываў да Дэкады па іншых жанрах. Тым больш падобнае нецярпіма ў практыцы работы сімфанічных аркестраў.

Поспех сімфанічных аркестраў Магілёва, Брэста і Мінскага Палаца культуры прафсаюзаў — вынік сістэматычнай рэпетыцыйнай работы, пастаяннай творчай патрабавальнасці да сябе. На жаль, выступленне віцеблян прайшло на нізкім мастацкім узроўні і не ўпрыгожыла добры і разнастайны справаздачны канцэрт вобласці, бо аркестр быў створаны напярэдадні Дэкады. Даводзіцца шкадаваць, што ў Віцебску дагэтуль няма добрага пастаяннага аматарскага сімфанічнага аркестра.

НЕКАЛЬКІ слоў пра рэпертуар сімфанічных аркестраў. Рабіць якія-небудзь пэўныя вывады аб рэпертуары праслуханых сімфанічных аркестраў немагчыма, бо ў канцэртах Дэкады яны выконвалі адзін або два творы. Аднак можна адзначыць як станоўчы факт, што ў іх праграмы былі ўключаны творы рускай класікі (Магілёўскі і Брэсцкі аркестры), беларускіх кампазітараў (Мінскі і Брэсцкі аркестры).

Нашы сімфанічныя аркестры — аматарскія музычныя калектывы, пакуль што адзіныя ў абласцях прапагандысты сімфанічнай музыкі. Таму рэпертуар гэтых аркестраў, таксама як і ўзровень іх канцэртнай дейнасці, мае важнае грамадскае значэнне. Гэтыя калектывы павінны ўплываць на выхаванне добрага музычнага густу. Улічваючы, што ў працэсе штодзённай рэпетыцыйнай і выканаўчай работы аркестры самі творча растуць, хочацца параіць ім на першым часе больш уключаць у свае праграмы твораў класікі. Мета навіта на гэтых творах павінен фарміравацца музычны густ слухачоў і саміх выканаўцаў, выпрацоўвацца строй, ансамбль. А потым, паступова ўскладняючы задачы, калектывам трэба пашыраць рэпертуар за лік твораў савецкіх кампазітараў і абавязкова беларускіх. Выкананне ў канцэртах твораў Шастаковіча, Пракоф'ева, Хачатурана і беларускіх кампазітараў асабліва важна і таму, што яно будзе прывучаць слухачоў да сучаснай музычнай інтанацыі, далучаць да сучаснай музычнай культуры, выхоўваць іх на музыцы сённяшняга дня.

Я ўжо адзначаў, што ў справаздачных канцэртах сімфанічныя аркестры выконвалі адзін-два творы. Па іх, вядома, цяжка меркаваць аб выканаўчай культуры і мастацкім узроўні калектыву. Каб больш аб'ектыўна ацаніць выступленне аркестра, патрэбна канцэртная праграма. Ясна, што на Дэкадзе аркестру немагчыма выступіць з асобным канцэртам або нават з канцэртным аддзяленнем.

Думаецца, што ў будучым было б мэтазгодна ўстанавіць такі парадак, пры якім аркестр павінен рыхтаваць да Дэкады праграму з пэўнай колькасці твораў класічнай музыкі і савецкіх (у тым ліку і беларускіх) кампазітараў.

Такая сістэма, як мне здаецца, магла быць карысная і пры падрыхтоўцы да Дэкады і выступленняў народных хораў і капэл (мы маем на ўвазе хоры, якія маюць званне «Народны»). Гэта ўзніме іх адказнасць, ускладніць творчыя задачы, а значыць будзе садзейнічаць росту іх майстэрства.

Каб аб'ектыўна ўлічваць і стымуляваць штодзённую работу сімфанічных аркестраў па прапагандзе музыкі, было б пажадана ў далейшым прадстаўляць журы друкаваныя праграмы, а таксама падрабязную даведку пра ўсе канцэрты і іх праграмы, праведзеныя аркестрам за міждэкадны перыяд або за апошні год.

Значна палепшылі б прапаганду сімфанічнай музыкі ў рэспубліцы арганізацыя абменных канцэртаў, гастрольныя паездкі сімфанічных аркестраў па абласцях і гарадах Беларусі. З усіх пунктаў гледжання будзе карысна і цікава пачуць Магілёўскі аркестр у Віцебску, Брэсцкі—у Гродна і г. д.

Цяснейшай павінна быць творчая сувязь аматарскіх сімфанічных аркестраў з вядучымі дырыжорамі і выканаўцамі рэспублікі.

ЭСТРАДНАЯ музыка вельмі папулярная сярод слухачоў, асабліва моладзі. Ужо даўно ады-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Шмат успамінаў і прац напісана пра Ільіча. З гэтымі кнігамі цікава пазнаёміцца чытачам. З любоўю афармляе кніжны стэнд загадчыца Дымшанаўскай бібліятэкі Віцебскага раёна Валянціна Ільвінова.

Фота І. СТЭЦА.

СЯБРОЎСКАЯ СУСТРЭЧА

З 12 па 16 красавіка ў Мінску, у клубе Саюза журналістаў БССР, праходзіў семінар рэдактараў раённых газет. Рэдактары абменьваліся вопытам, слухалі даклады, лекцыі, гутаркі.

Адбылася таксама сустрэча ўдзельнікаў семінара з пісьменнікамі, рэдактарамі і супрацоўнікамі рэспубліканскіх літаратурных выданняў і выдавецтва «Беларусь». Галоўны рэдактар часопіса «Вожык» П. Кавалёў, намеснік галоўнага рэдактара «Маладосці» А. Асіпенка, адказны сакратар часопіса «Полымя» А. Бачыла, галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» Н. Пашкевіч, галоўны рэдактар часопіса «Беларусь» М. Калачынскі, адказны рэдактар «Бярозкі» К. Кірэенка, рэдактар часопіса «Работніца і сялянка» А. Ус гаварылі аб задачах і творчых планах сваіх выданняў, узнімалі пытанне аб неабходнасці больш актыўна папулярызаваць і прапагандаваць на старонках раённага друку творы літаратуры і мастацтва.

Літкансультант «Сельской газеты» паэт М. Хведаровіч спыніўся ў сваім выступленні на рабоце літаратурных аб'яднанняў пры рэдакцыях раённых газет. Аб выдавецкіх планах, аб новых кнігах, якія неўзабаве выйдуць у свет, расказаў удзельнікам семінара А. Бажко — загадчык рэдакцыі мастацкай літаратуры выдавецтва «Беларусь».

А. Бачыла, А. Бажко, С. Грахоўскі, Хв. Жычка, М. Калачынскі, М. Хведаровіч прачыталі на сустрэчы свае творы.

СРОДКАМІ ОПЕРНАГА ЖАНРУ

Набліжаюцца знамянальныя для савецкага народа даты—50-годдзе Вялікага Кастрычніка і 100-годдзе з дня нараджэння заснавальніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, правадыра пралетарскай рэвалюцыі Уладзіміра Ільіча Леніна. Пісьменнікі, мастакі, кампазітары напружана працуюць цяпер, каб адлюстраваць у сваіх творах найбольш значныя падзеі ў паўстагадовай барацьбе Краіны Саветаў за шчасце ўсяго чалавецтва. Зразумела, што як у напісаных творах, так і ў тых, якія знаходзяцца яшчэ ў рабоце, вобраз Леніна займае асаблівае месца.

Нашы кампазітары, працуючы ў ў розных жанрах, прысвячаюць светламу вобразу Ільіча свае новыя творы. Масавыя песні, вакальныя цыклы, кантаты, араторыі, сімфоніі, музыка ў кіно, дзе дзеянне фільма звязана з вобразам Ільіча, вельмі ўзбагацілі наша музычнае мастацтва. Вось толькі ў галіне оперы гэтая праблема доўгі час заставалася нявырашаная. І не дзіва. Опера—мастацтва сінтэтычнае і ў параўнанні з драматычным тэатрам больш умоўнае. Таму творчыя пошукі новага ў музычным тэатры маюць своеасаблівыя цяжкасці.

Некаторыя, напрыклад, лічаць наогул немагчымым стварыць вобраз Леніна на опернай сцэне. Напрошваецца пытанне: чаму? Удаецца ж увасобіць вобраз вялікага правадыра ў кіно, драме і нават іншы раз на канцэртнай эстрадзе, хоць і там таксама існуе ўмоўнасць. Мне думаецца, што многае тут залежыць ад таленту акцёра і рэжысёра, іх гранічнай тактоўнасці пры вырашэнні такой складанай творчай задачы.

Вядома, што яшчэ ў 1936 годзе Ціхан Хрэннікаў увёў у сваю оперу «У буру» невялікі эпізод: Ленін прымае тамбоўскіх хадакоў у Крамлі. Праўда, спроба маладога тады яшчэ кампазітара была вельмі нясмелая. Бо эпізод з хадакамі быў вырашаны не музычнымі сродкамі, а сродкамі драматычнага мастацтва. Аднак, увайшоўшы даволі арганічна ў агульную тканіну музычна-сцэнічнага твора, гэты эпізод прымусіў многіх кампазітараў сур'ёзна задумацца над праблемай стварэння вобраза правадыра ў оперы.

Некалькі гадоў назад на сцэне Куйбышаўскага тэатра была пастаўлена опера Васілія Дзегцярова «Чалавек з ружжом», лібрэта якой заснавана на сюжэце п'есы М. Пагодзіна. У гэтай оперы роля Леніна стала больш важкай і зроблена яна чыста вакальнымі сродкамі.

Удала, на мой погляд, вырашана гэтая цяжкая задача і ў оперы «Кастрычнік» Вано Мурадэлі, якая пастаўлена ў Маскве, Ленінградзе, Новасібірску і якая цяпер, як мне вядома, ставіцца Беларускім тэатрам оперы і балета.

Спробы паказаць Леніна на опернай сцэне вядуцца ў многіх гарадах і рэспубліках краіны.

Я таксама працую зараз над операй, прысвечанай будучай знамянальнай даце—пяцідзесяцігоддзю Вялікага Кастрычніка. Яна будзе называцца «Віхуры варожыя». Лібрэта заснавана на двухтомнай «Гісторыі Кіраўскага завода». Сусветна вядомы «Чырвоны пуцілавец», пачынальнік рабочага рэвалюцыйнага руху ў Расіі, важны для мяне як канкрэтнае месца дзеяння першых слаўных і цяжкіх гадоў пралетарскай рэвалюцыі. Першая карціна оперы цалкам прысвечана Леніну, які з мінуты на мінуту чакае гістарычнага стрэлу «Аўроры». Гэтую сцэну я спрабаваў вырашыць чыста вакальнымі сродкамі, у форме опернага маналога.

Мне думаецца, што лірычная, рамантычная прырода самой музыкі павінна быць выкарыстана ў паказе вобраза Леніна ў оперным спектаклі. Усялякая бытаўшчына, прыёмы натуралізму або плакатнасці могуць не толькі перашкодзіць паказу, але і сказіць самую сутнасць творчай задачы.

Я ўпэўнены, што і на опернай сцэне вобраз незабыўнага Ільіча можа і павінен быць яркі, праўдзівы і блізкі нашаму гледачу і слухачу.

Іван ДЗЯРЖЫНСКІ,
кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтва РСФСР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

На здымку — сцэна са спектакля. «Людзі і разбойнікі Кардамона».

ТЭАТРАЛЬНАЯ ПРЭМ'ЕРА

У рэспубліканскім Тэатры юнага гледача адбылася прэм'ера спектакля па п'есе нарвежскага драматурга Турб'ёрна Эгнера «Людзі і разбойнікі Кардамона».

Рэжысёр спектакля і мастак — дыпламанты Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута В. Кісялёў і А. Салаўёў, кампазітар—Я. Дзягцярык.

У спектаклі заняты артысты Ул. Говар-Бандарэнка, Ю. Фляйто, Л. Міхайлаў, П. Ротар, П. Дубашынскі, Б. Піскун, Ул. Раманоўскі і інш.

На рэпетыцыі оперы «Кастрычнік». Справа—рэжысёр Д. Смоліч.

Фота Ул. КРУКА.

ІДУЦЬ РЭПЕТЫЦЫІ...

ПРА РЭВАЛЮЦЫЮ І ЯЕ ПРАВАДЫРА

Вобраз Леніна на беларускай опернай сцэне... Такога спектакля ў Мінску яшчэ не было, але ён хутка будзе, вялікі музычны спектакль пра Кастрычніцкую рэвалюцыю, пра тое, як пад кіраўніцтвам дарагога Ільіча народы Расіі назаўсёды скінулі прыгнёт самадзяржаўя і набылі для сябе свабоду і шчасце. Гаворка ідзе пра оперу В. Мурадэлі «Кастрычнік», якая цяпер ставіцца калектывам Беларускага тэатра оперы і балета.

Аркестравая рэпетыцыя закончылася. Музыкантаў павінны былі змяніць хор і салісты, якія пакуль праходзяць асобныя карціны «Кастрычніка» пад раяль.

Я падышоў да музычнага кіраўніка спектакля, дырыжора І. Абраміса.

— Што сёння рэпеціраваў аркестр?

— Пятую і восьмую фінальную карціны, — гаворыць дырыжор. — Яны самыя масавыя і найбольш адказныя ў оперы. У першай з іх пад выглядам вяселля праводзіцца сходка на кватэры старога рабочага-рэвалюцыянера Івана Цімафеевіча, куды раптам урываюцца белагвардзейцы, шукаючы Леніна. А апошняя карціна — гэта кастрычніцкая ноч ля Смольнага, перад пачаткам штурму Зімняга палаца. Сцэнічнай раскадроўкай гэтай карціны і давядзецца займацца сёння пастаноўшчыкам і мне з салістамі і артыстамі хору, каб потым звесці іх з аркестрам.

— Сольныя і харавыя партыі цалкам развучаны, — працягвае дырыжор.—Асэнсаваны сцэнічны характар кожнага вобраза. Усе тры карціны першага акта ўжо рэпеціруюцца пад аркестр. Цяпер чарга за масавымі харавымі сцэнамі.

Пакуль мы вялі размову з Абрамісам, на сцэне ўжо сабраліся ўсе, хто заняты ў фінале спектакля. Побач з галоўным рэжысёрам тэатра Д. Смолічам я заўважыў бялявую дзяўчыну ў строгай чорнай сукенцы, якая пра нешта з ім гутарыла.

— Вярбоўская, — тлумачыць дырыжор, — дыпламантка нашага тэатральна-мастацкага інстытута. Яна і ставіць «Кастрычнік» пад кіраўніцтвам Дзмітрыя Мікалаевіча.

Прайшло некалькі хвілін. На сцэне ўсталявалася цішыня. І рэпетыцыя пачалася.

...Кастрычніцкая ноч ля Смольнага. Ноч, калі народ атрымаў перамогу над самадзяржаўем, калі з дапамогаю зброі ўзяў уладу ў свае рукі. Пасля доўгай разлукі сустракаюцца блізкія адзін аднаму кіраўнік бальшавіцкага падполля Андрэй і Марына (на рэпетыцыі гэтыя партыі выконвалі па чарзе В. Чарнабаеў і А. Бокаў, а таксама Л. Ганестава). Яны шчаслівыя, яны ведаюць, што наступае новае жыццё, асветленае нязгасным святлом ленінскіх ідэй, і клянуцца быць вернымі рэвалюцыі, ісці поруч насустрач будучыні. Але ў той момант, калі Андрэй гаворыць прамову на плошчы перад Смольным, заклікаючы да ўзброенага паўстання, з натоўпу раптам паяўляецца зацяты белагвардзеец Масальскі (В. Гур'еў), які даўно хацеў расправіцца з Андрэем. Раздаецца стрэл, але куля трапляе не ў кіраўніка бальшавікоў, а ў Марыну, што засланіла сабою свайго каханага сябра ад вернай смерці...

— Прашу паўтарыць усю сцэну з паяўленнем Масальскага, — просіць Д. Смоліч. — Над забітай павінны схіліцца сумныя фігуры. Больш смутку, калі гучыць харавы рэквіем!

Рэпетыцыя працягваецца. Ідуць пошукі новых, больш выразных дэталей па кожнай мізансцэне, правяраецца натуральнасць паводзін артыстаў і ўдакладняецца адпаведнасць музычна-інтанацыйных фарбаў з агульным сцэнічным малюнкам таго або іншага персанажа. Тут умешваецца і дырыжор. У дуэце Андрэя і Марыны ён, напрыклад, папрасіў, каб Ганестава не займалася расцягваннем нот, а больш урачыста, прыўзнята і выразна даносіла да слухача кожную вакальную фразу.

Невялікі перапынак. Скарыстаўшы яго, я вырашыў пагутарыць і са Смолічам пра новую работу тэатра. Дзмітрый Мікалаевіч знаёміць мяне са сваім маладым калегам — Вацлавай Вярбоўскай.

— Гэта яе першы, да таго ж дыпломны спектакль, — зазначае галоўны рэжысёр. — Я кіраўнік спектакля, а яна яго пастаноўшчык. Мала таго, што «Кастрычнік» — маштабны, манументальны твор, дзе многа дзеючых асоб, дзе вялікія, трэба сказаць, вельмі прыгожыя харавыя эпізоды і вельмі цяжкія ў вакальных адносінах сольныя партыі. Асноўная цяжкасць — стварэнне праўдзівага вобраза вялікага правадыра. У ролі Леніна выступяць А. Генералаў і І. Сарокін. Яны, натуральна, вельмі хвалююцца. У нас былі сустрэчы з кампазітарам, які памог больш дакладна вызначыць драматургічныя вузлы музычнага твора. Мы запросім Мурадэлі прыехаць у Мінск і на здачу спектакля. Увесь творчы калектыў — салісты, хор, балетная трупа, аркестр, — а таксама работнікі пастановачнай часткі з захапленнем і напружаннем рыхтуюць гэты спектакль. Танцы ставіць А. Дадзішкіліяні, хормайстар — А. Кагадзееў, афармляе спектакль мастак Я. Чамадураў. А цяпер я вас пакіну — працягнеце размову з Вярбоўскай.

І тут я даведаўся, што малады рэжысёр адначасова вучыцца ў Беларускай кансерваторыі па класу вакала. Гэта, безумоўна, дапамагае ёй у рабоце над музычным спектаклем. Вярбоўская расказала пра тое, якім павінна быць мастацкае афармленне, пазнаёміла з эскізамі дэкарацый.

Пасля перапынку зноў рэпеціраваўся фінал. Некаторыя салісты памяняліся. Так, замест В. Чарнабаева партыю Андрэя пачаў спяваць А. Бокаў, а В. Гур'ева—выканаўцу ролі Масальскага— змяніў Б. Нікольскі. Астатнія былі тыя ж — Л. Ганестава, С. Фралоў (Іван Цімафеевіч), Т. Ніжнікава (Леначка), В. Ганчарэнка (Ільюша) і іншыя. Асобныя эпізоды паўтараліся па некалькі разоў і з яшчэ большай настойлівасцю.

Не так ужо шмат часу засталося да музычнай прэм'еры. Беларускі тэатр выпусціць «Кастрычнік» В. Мурадэлі да 20-годдзя нашай перамогі над фашысцкай Германіяй як падарунак знамянальнай даце ў жыцці савецкіх людзей.

Г. ЗАГАРОДНІ.

Успамінаючы былыя паходы

ГЛЯДЗЕЛЬНАЯ ЗАЛА— ПЯРЭДНІ КРАЙ

Барыс ЯНПОЛЬСКІ,
заслужаны артыст БССР, былы палітрук франтавой брыгады

Наш Тэатр імя Янкі Купалы вайна застала ў гастрольнай паездцы ў Адэсе. Помніцца нечаканае выццё сірэн, зенітныя выбухі, паветраныя баі над горадам. Тэатр вымушаны быў спыніць работу. Адэскі абком партыі атрымаў загад: адправіць калектыў Беларускага тэатра ў Маскву. З Масквы ж нас па рашэнню ўрада накіравалі ў Томск.

У Сібіры тэатр актыўна ўключыўся ў абслугоўванне армейскіх часцей, ваенных вучылішчаў, шпіталяў і лагераў, дзе фарміраваліся франтавыя часці. Адначасова брыгада тэатра выязджала ў сібірскія калгасы, асабліва ў час сяўбы і жніва. Ездзілі мы і да нарымскіх рыбакоў.

Хутка да нас дайшлі чуткі, што некаторыя тэатры пасылаюць свае брыгады на фронт. Гэта ўзрадавала нас, мы звярнуліся ў Савет Міністраў БССР з просьбай дазволіць і нам накіраваць на фронт сваю брыгаду.

З чэрвеня 1943 года брыгада ў складзе артыстаў Г. Глебава, Л. Рахленкі, В. Пола, Р. Кашэльнікавай, П. Пекура, З. Стомы, Б. Янпольскага, Э. Шапко, М. Шашалевіч, З. Лідскай, С. Глікмана, Я. Зайчык, намесніка дырэктара А. Гайдарына і струннага квартэта — Б. Афанасьева, В. Цыпорына, Б. Хавіна і В. Бярлінскага прыехала ў Маскву.

Рэпертуар мы везлі з сабой вялікі і разнастайны: урыўкі з п'ес «Фронт» А. Карнейчука і «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, вершы, сатырычныя сцэнкі, музычныя творы і песні. А пасля прагляду нашага канцэрта ваенным камандаваннем рэпертуар быў яшчэ пашыраны. Былі падрыхтаваны скарочаны варыянт камедыі Мальера «Скупы», беларускія народныя песні ў суправаджэнні канцэрціны (Стома) і баяна (Янпольскі), рускія, беларускія, украінскія, грузінскія, казахскія і іншыя песні для струннага квартэта.

7 чэрвеня мы даведаліся, што нас накіроўваюць на Калінінскі фронт, а 8 былі ўжо ў Тарапцы, дзе сустрэлі мінчаніна капітана Г. Тарана, якому было даручана даставіць нас у палітаддзел фронту. Тут адбылося наша першае выступленне. На другі дзень нам далі старэнькі аўтобус і цудоўнага хлопца шафёра, з якім мы не разлучаліся на працягу амаль двух месяцаў.

Усяго тыдзень мы абслугоўвалі франтавыя тылы, а потым — выключна пярэдні край. Воіны вельмі цёпла, з вялікай цікавасцю прымалі і слухалі нашу праграму. У час выканання народных песень мы бачылі слёзы на вачах у маладых салдат і сівых камандзіраў. Пасля нашых выступленняў часта стыхійна ўзнікалі мітынгі. Афіцэры і салдаты давалі клятву вызваліць родную зямлю ад фашысцкай погані.

Я ўспамінаю адну сустрэчу, якая так хораша пачалася, але мела сумны канец.

Быў цудоўны пагодны дзень. Неяк не верылася, што побач ідзе вайна і гінуць людзі. Мы выступалі ў адным вялікім падраздзяленні. Ішоў спектакль «Скупы». Сцэнай нашай была адкрытая камуфляжная палатка, якую мы вазілі з сабой. На вялікай лясной палянцы сядзела шмат воінаў. Для маскіроўкі яны трымалі ў руках зялёныя галінкі. Сярод іх было нямала беларусаў, якія добра ведалі нашых старэйшых акцёраў. Г. Глебаў, які выконваў ролю скнары-Гарпагона, па ходу п'есы звярнуўся да гледачоў: «Вы не ведаеце, хто ўкраў маю шкатулку, куды ён схаваўся?» А ў гэты час над палянай стаў кружыць нямецкі самалёт — разведчык «фоке-вульф». Г. Глебаў выскачыў з палаткі-сцэны і, паказваючы пальцам на самалёт, закрычаў: «Вунь там угары! Вось ён мой злачынец!» Гэта выклікала выбух смеху, давялося чакаць некалькі мінут, пакуль ён сціх.

Пасля п'есы мы далі канцэрт, які выклікаў гарачыя воплескі. Сардэчна развітаўшыся з гледачамі, селі ў аўтобус. Калі ўсе пачалі разыходзіцца, гітлераўцы адкрылі ўраганны артылерыйскі і мінамётны агонь. Шмат людзей было паранена. Аб гэтым мы даведаліся праз некалькі дзён, абслугоўваючы палявы шпіталь, дзе сустрэлі знаёмых нам салдат і афіцэраў. Гэта была вельмі сумная, горкая сустрэча.

У адным падраздзяленні 43-й арміі, куды прыехалі позна вечарам, мы пазнаёміліся з маладым лейтэнантам-тапографам Мікалаем Сіверсам. Гэта быў вельмі сімпатычны, надзвычай сціплы юнак невялікага росту. Мне давялося начаваць з ім у адной зямлянцы. Пакуль клаліся спаць, ён расказаў мне, што нарадзіўся на Украіне, у Херсоне. Сам скончыў музычную школу і рыхтаваўся да паступлення ў вучылішча, але вайна перашкодзіла яго намерам. Раніцай, калі сабраліся ўсе ўдзельнікі нашай брыгады, Коля Сіверс узяў у рукі гітару і стаў выконваць самыя складаныя музычныя творы.

М. Сіверс быў не толькі таленавітым выканаўцам, але і кампазітарам. За адну ноч ён склаў для нашага струннага квартэта вельмі цікавы музычны твор, прысвечаны памяці Зоі Касмадзям'янскай, які пасля карыстаўся вялікім поспехам. Мы пасябравалі з гэтым цудоўным юнаком. Калі вярнуліся ў Томск, Л. Рахленка некалькі месяцаў перапісваўся з ім. Пазней мы даведаліся, што Коля загінуў у баі за Радзіму. З вялікім болем успрынялі мы гэтую вестку, хоць разумелі, што кожны дзень, кожную гадзіну гінуць сотні і тысячы лепшых людзей.

Аднойчы нам давялося вельмі пахвалявацца за нашых актрыс. Нас накіравалі ў батальён, які знаходзіўся на самым пярэднім краі абароны. Дабірацца туды машынамі нельга было. Актрыс павезлі на коні, а мы пайшлі пехатой праз лес. Вялі нас салдаты-разведчыкі. Калі мы прыйшлі на месца, нашых жанчын яшчэ не было. Мы пачакалі гадзіну, другую, а іх усё няма. Занепакоіліся. Асабліва хваляваўся камбат, калі даведаўся, што павезлі іх дарогай, якая абстрэльвалася. Тэрмінова былі пасланы на пошукі тры разведчыкі, якія нарэшце прывялі нашых жанчын. Аказалася, яны збіліся з дарогі і трапілі на ваенны дазор.

Помніцца і такі выпадак. У адным падраздзяленні перад самым канцэртам скрыпач нашага квартэта Барыс Хавін нечакана захварэў і іграць не мог. Калі аб'явілі, што квартэт з гэтай прычыны выступіць не можа, з натоўпу выйшаў малады хлопец-лейтэнант і прапанаваў свае паслугі для замены. Калі ён выйшаў са скрыпкай і сеў побач з нашымі музыкантамі, байцы доўга апладзіравалі свайму афіцэру, які без падрыхтоўкі добра сыграў увесь рэпертуар. Як мы потым даведаліся, гэта ў мінулым студэнт Харкаўскай кансерваторыі, як і Сіверс, вопытны і кваліфікаваны музыкант.

Усюды на фронце прымалі нас як самых блізкіх і родных. Франтавыя газеты пісалі: «Брыгада беларускіх артыстаў сваёй мужнасцю і майстэрствам узнімае баявы дух у нашых воінаў і натхняе іх на ратныя подзвігі». Мы выступалі раніцай, днём і вечарам. Абслугоўвалі часці перад боем і пасля бою. Палітаддзел фронту даў высокую ацэнку нашай франтавой рабоце.

75 канцэртаў былі нашым сціплым падарункам франтавікам.

З франтавой камандзіроўкі мы зноў вярнуліся ў Томск. На працягу трох гадоў калектыў працаваў без выхадных дзён і гэта дало нам магчымасць сабраць сродкі на танкавую калону і купіць самалёт. За гэта тэатр атрымаў урадавую падзяку.

Гады Вялікай Айчыннай вайны назаўсёды застануцца ў нашай памяці, а франтавыя сябры, якія загінулі смерцю храбрых, будуць вечна жыць у нашых сэрцах.

Франтавікі заўсёды радаваліся сустрэчы з купалаўцамі.

АРКЕСТРЫ. ІХ ШЛЯХІ-ДАРОГІ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

шло ў нябыт пытанне, ці мае ў нас права грамадзянства джаз, або, як мы яго называем баязліва, «эстрадны аркестр». Сёння задача заключаецца ў тым, каб развіваць сваю джазавую музыку і проціпаставіць яе безыдэйнай і антымастацкай джазавай музыцы буржуазнага Захаду.

Трэба больш актыўна ствараць і развіваць савецкую джазавую манеру ігры, якая грунтуецца на добрым музычным гусце. Трэба ствараць і прапагандаваць творы савецкіх кампазітараў для джаза, якія маюць у сваёй аснове народныя і сучасныя інтанацыі, спалучаюць меладычнасць з разнастайнасцю вострых танцавальных рытмаў і маляўнічасцю гармоніі і аркестроўкі. Гэта будзе той бар'ер, якім можна і трэба закрыць доступ да нас пошлай і разбэшчанай музыкі Захаду.

З гэтых пазіцый выступленне эстрадных аркестраў Мінскага Палаца культуры прафсаюзаў (кіраўнік Л. Ляноўскі) і эстраднага аркестра Пінска (кіраўнік В. Бруснеў) было радаснай з'явай. Выкананне абодвух калектываў мела адзнаку добрага густу. Аркестры гучалі мякка, без празмернага фарсіравання гуку. Асабліва вабіла мяккасць гучання Пінскага аркестра. Мінскі эстрадны аркестр бліскуча выканаў п'есу на тэму беларускага народнага танца «Бульба» (аўтар Л. Ляноўскі). Прыемна, што, уключыўшы ў свой рэпертуар гэтую п'есу, аркестр ідзе па правільным шляху пашырэння свайго рэпертуару за кошт твораў, музычны матэрыял якіх цесна звязаны з інтанацыямі народнай музыкі, з беларускім нацыянальным меласам. У гэтай п'есе аўтар умела апрацаваў, удала гарманізаваў і добра аркестраваў тэму «Бульбы».

На жаль, астатнія эстрадныя аркестры, якія выступілі на Дэкадзе, не дасягнулі той культуры выканаўчага майстэрства, якая характарызавала выступленні названых вышэй двух калектываў.

Не пазбавіліся ад рэзкага гучання медзі ўвогуле добрыя эстрадныя аркестры Лепеля (кіраўнік П. Чабаненка) і Слуцка (кіраўнік Р. Магалімаў). Гэтым аркестрам у сваёй штодзённай рабоце (асабліва Слуцкаму) патрэбна дамагацца большай чысціні гучання, лепшых суадносін у гучанні асобных аркестравых груп.

Не парадаваў слухачоў эстрадны аркестр Палаца культуры завода «Гомсельмаш» (кіраўнік Г. Фрадэр), які выканаў фантазію Б. Тупіцына на тэмы песень І. Дунаеўскага. У ігры было шмат нястройнасці, агульнае гучанне было рэзкае і крыклівае.

Гэтыя недахопы, відаць, не з'яўляюцца выпадковымі. Многія нашы самадзейныя эстрадныя аркестры і ансамблі яшчэ не пазбавіліся ад манеры ігры па прынцыпу—«хто гучней». Далёка недасканалая ў аркестрах культура выканання.

Эстрадныя аркестры вельмі папулярныя. І таму часта бывае, што ў пагоні за тым, каб абавязкова стварыць свой (!) эстрадны аркестр, кіраўнікі мастацкай самадзейнасці не ўлічваюць вялікай адказнасці, якую яны бяруць на сябе. Ствараючы такія музычныя калектывы, не ўзважваюць сваіх магчымасцей, забываючы, што эстрадны аркестр павінен быць калектывам адукаваных музыкантаў-аматараў. Важная яшчэ адна акалічнасць: эстрадныя аркестры закліканы прапагандаваць і выхоўваць добры музычны густ у масавага слухача. На жаль, многія эстрадныя аматарскія аркестры не толькі не садзейнічаюць выхаванню добрага музычнага густу, не толькі не з'яўляюцца бар'ерам супраць пранікнення ў асяроддзе нашай моладзі буржуазнага джазавага «мастацтва», але міжволі сваёй дрэннай якасцю ігры і непатрабавальнасцю да рэпертуару апашляюць гэты жанр мастацтва.

Вось чаму перш за ўсё трэба, на наш погляд, ставіцца вельмі ўважліва і пільна да стварэння эстрадных калектываў, а там, дзе яны паяўляюцца, клапатліва, з пачуццём вялікай адказнасці займацца іх выхаваннем і павышэннем іх выканаўчай культуры і майстэрства.

Гаворачы пра эстрадныя аркестры, варта асобна спыніцца на аркестрах і ансамблях, якія суправаджалі выступленні вакалістаў, выканаўцаў арыгінальнага жанру, танцавальных калектываў.

Культурна і чыста акампаніраваў эстрадны квартэт выступленню сілавых акрабатаў (Віцебск). Добра акампаніраваў Г. Мясаедавай, якая выканала «Вальс аб вальсе» І. Калманоўскага, інструментальны квінтэт Гродзенскага Палаца культуры тэкстыльшчыкаў.

Эмацыянальна, дынамічна гнутка і стройна суправаджаў вакальна-харэаграфічную кампазіцыю «Брэсцкая крэпасць» аркестр пад кіраўніцтвам І. Раеўскага (Мінск). Добры строй і зладжанасць наглядаліся ў аркестры народнага ансамбля танца «Лявоніха» Дома культуры трактарнага завода.

У гэтых канцэртных нумарах аркестр з'яўляўся раўнапраўным кампанентам калектываў, што выступалі. Да іх кіраўнікі прад'яўлялі такія ж высокія патрабаванні, як і да ўдзельнікаў танцавальных і вакальных груп. Аднак былі выпадкі, калі аркестры не памагалі раскрыццю мастацкай задумы, а, больш таго, перашкаджалі выканаўцам, псавалі слухачам уражанне. Для прыкладу можна прывесці выкананне малдаўскага танца ансамблем «Дружба» (Магілёў), дзе аркестр іграў фальшыва і груба.

У цікава задуманай і добра пастаўленай кампазіцыі «Зоры над Пінаю» (Пінск) аркестр іграў неахайна, чым знізіў мастацкае ўражанне ад нумара. Тое ж можна сказаць і пра музычнае суправаджэнне харэаграфічнай кампазіцыі «Гэтага забыць нельга» (Віцебск), пра пачатак справаздачнага канцэрта Брэсцкай вобласці, калі ігралі не настроеныя фанфары і аркестр у пралогу «Брэсцкая крэпасць» гучаў надзвычай фальшыва.

Кіраўнікі мастацкай самадзейнасці павінны звяртаць сур'ёзную ўвагу на гэтыя «дробязі», прад'яўляць значна больш высокія патрабаванні да аркестраў, якія суправаджаюць выступленні харавых, танцавальных і іншых калектываў.

Папулярнымі ў народзе з'яўляюцца духавыя аркестры. На жаль, яны знаходзяцца на вельмі нізкім узроўні.

На Дэкадзе быў прадстаўлены ўсяго толькі адзін (!) духавы аркестр Дома культуры Мінскага трактарнага завода. Вялікая праца яго кіраўніка А. Сарокіна, усіх удзельнікаў гэтага цудоўнага калектыву па заслугах ацэнены слухачамі і журы. Аркестр выканаў «Галоп» з оперы Ю. Семянякі «Калючая ружа», іграў чыста, прадэманстраваў зладжаны ансамбль, вялікую дынамічную гнуткасць, добры густ. Калектыў мае ўсе падставы пашыраць і ўзбагачаць сваю праграму за кошт лепшых твораў беларускіх кампазітараў, савецкай, рускай і зарубежнай музычнай класікі. І, безумоўна, аркестр здолее выступаць на канцэртных эстрадах у ліку лепшых самадзейных калектываў. Як і сімфанічныя аркестры, ён можа і павінен займацца пастаяннай прапагандай музычнай культуры сярод самых шырокіх мас слухачоў.

Але ці толькі ён адзін павінен займацца канцэртнай дзейнасцю?

Сёння большасць духавых самадзейных аркестраў так дрэнна ўкамплектаваны, такія яны немастацкія, што з'яўляюцца хутчэй «сезоннымі» аркестрамі, якія існуюць толькі для ігры на дэманстрацыях і сходах.

Ці правільна так звужаць вялікую грамадскую ролю духавых аркестраў? Рэспубліканскаму і абласным дамам народнай творчасці, прафесіянальным арганізацыям, якія адказваюць за развіццё музычнай самадзейнасці, трэба сур'ёзна задумацца над тым, што вельмі марудна развіваецца (калі ўвогуле дарэчы будзе слова «развіваецца») мастацтва духавых самадзейных аркестраў.

І, відаць, той факт, што ні адна вобласць не прыслала на Дэкаду ніводнага духавога аркестра (за выключэннем аркестра трактарнага завода), гаворыць пра недаацэнку гэтага масавага, любімага ў народзе жанру, здольнага дзейсна ўплываць на выхаванне добрага музычнага густу.

Час ужо змяніць адносіны да духавых аркестраў, як да калектываў, якія маюць утылітарнае прызначэнне. Спецыфіка духавых аркестраў дазваляе выступаць ім у самых розных умовах—ад клуба да пляцоўкі, ад танцавальнай веранды і канцэртнай эстрады да цэхаў заводаў, палявых станаў. Кожны горад, буйнае прадпрыемства, саўгас і калгас могуць мець свае добрыя аркестры.

Вялікую дапамогу духавым аркестрам у рабоце, у набыцці рэпертуару (у тым ліку і вучэбна-метадычнага характару) павінны аказаць дамы народнай творчасці. Відаць, час ужо стварыць у Беларусі пастаянныя курсы кіраўнікоў самадзейных духавых аркестраў пры Рэспубліканскім Доме народнай творчасці. Можна было б перыядычна збіраць на кароткатэрміновыя семінары кіраўнікоў духавых аркестраў, якія адчуваюць патрэбу ў кваліфікаванай дапамозе. Магчыма, было б карысна запрашаць на такія семінары таксама і дырыжораў эстрадных і сімфанічных аркестраў.

Музыка ўсё больш уваходзіць у жыццё і быт нашага народа, усё больш уплывае на фарміраванне яго эстэтычных густаў, з'яўляецца важнай, састаўной часткай ідэалагічнага выхавання савецкіх людзей. Сімфанічныя, эстрадныя і духавыя аркестры побач з іншымі формамі мастацкай самадзейнасці — важная частка музычнай культуры нашага народа. За апошнія гады яны дамагліся значных поспехаў у сваім творчым росце. Выступленні іх на трэцяй Дэкадзе народнай творчасці БССР—яскравы таму доказ.

Усім нам, работнікам культурнага фронту, трэба імкнуцца, каб творчы рост нашых інструментальных калектываў ішоў яшчэ больш актыўна.

ПАРТЫЗАНСКАЯ МУЖНАСЦЬ

Гісторыкі, публіцысты, пісьменнікі, мастакі, ветэраны баёў прысвяцілі тэме Вялікай Айчыннай вайны лепшыя свае творы. У апошні час пра гераічную барацьбу партызан напісана яшчэ адна цікавая кніга «Партызанская рэспубліка», якая выйшла ў Ваенным выдавецтве Міністэрства абароны СССР. Аўтар яе — былы другі сакратар ЦК КП Беларусі, начальнік Беларускага штаба партызанскага руху П. Калінін.

Мінскі акруговы Дом афіцэраў і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны правялі канферэнцыю чытачоў па гэтай кнізе. У ёй прынялі ўдзел генералы і афіцэры, праслаўленыя партызаны і навуковыя работнікі, салдаты.

Размова выйшла далёка за рамкі абмяркоўваемай кнігі. Прысутныя ўспаміналі былыя баі і паходы, адзначалі ролю мемуарнай літаратуры ў справе выхавання падрастаючага пакалення на ўласных баявых традыцыях. Яны адзначалі, што каштоўнасць кнігі перш за ўсё ў сабраным аўтарам багатым фактычным матэрыяле. У кнізе прыводзіцца шмат раней неапублікаваных дакументаў пра мужнасць і адвагу савецкага народа ў дні Вялікай Айчыннай вайны.

Былы камандзір Магілёўскага партызанскага злучэння С. Сідарэнка-Салдаценка, сакратар Слуцкага падпольнага райкома партыі А. Сцяпанава, партызан, а цяпер маёр М. Немец гаварылі, што П. Калінін здолеў пераканальна паказаць, як камуністы і камсамольцы рэспублікі выступілі на барацьбу з ворагам і склалі ядро партызанскіх часцей і злучэнняў.

Афіцэр Ф. Качарга адзначыў, што ў кнізе няма ні мудрагелістага сюжэта, ні аўтарскага вымыслу. У ёй — толькі факты, толькі праўда пра цяжкую барацьбу воінаў і партызан з гітлераўцамі.

На канферэнцыі выступілі Героі Савецкага Саюза Я. Вайнруб і Р. Мачульскі, а таксама былы камандзір партызанскага атрада «Іскра» В. Дзерабін, мінскі падпольшчык П. Ляхоўскі, афіцэры запасу Б. Герасімовіч, К. Дамарад, афіцэр Ю. Баранаў, старшая навуковая супрацоўніца Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Д. Петрачэнка, былы начальнік штаба Мінскай партызанскай брыгады М. Джагараў, радавы М. Касцюк.

Я. МАЛЫ.

Ул. І. ЛЕНІНУ АД БДУ

У Крамлі, у асабістай бібліятэцы Ул. І. Леніна захоўваецца больш дзесятка кніг, напісаных супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Усе яны, у асноўным, выдадзены ў Мінску. Тры з іх — даравальныя экземпляры Белдзяржуніверсітэта, аб чым гавораць надпісы на іх тытульных лістах.

Узнікненне Беларускага дзяржаўнага універсітэта звязана з імем Уладзіміра Ільіча Леніна. У 1919 г., 28 студзеня, быў апублікаваны падпісаны Ул. І. Леніным дэкрэт Савета Народных Камісараў, у якім гаварылася: «У азнаменаванне Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., якая разняволіла працоўныя масы ад палітычнага, эканамічнага і духоўнага прыгнёту з боку маёмасных класаў і адкрыла ім шырокія дарогі да крыніц ведаў і культуры, стварыць дзяржаўныя універсітэты...» 11 ліпеня 1921 г. на сходзе грамадскасці сталіцы Беларусі, прысвечаным адкрыццю універсітэта, яго ўдзельнікі сваё першае прывітанне паслалі Ільічу. Яны пісалі: «Адкрываючы ў дзень вызвалення Мінска — сталіцы Беларусі — Беларускі дзяржаўны універсітэт, урачысты сход, прысвечаны яго адкрыццю, ад імя партыйных, рабочых, культурных і грамадскіх сіл краю шле Вам, дарагі правадыр, сваё гарачае прывітанне».

У 1922 г., падагульняючы першы навучальны год, член праўлення універсітэта прафесар С. З. Кацэнбогін склаў невялікую (40 стар.) кнігу «Беларускі дзяржаўны універсітэт за 1921—22 акадэмічны год». У тым жа годзе кніга была выдадзена Дзяржвыдавецтвам Беларусі, а адзін з першых яе экземпляраў пасланы ў Маскву з надпісам на тытульным лісце: «Уладзіміру Ільічу Леніну ад Беларускага дзяржаўнага універсітэта». Дакладна з такім жа надпісам захоўваецца ў бібліятэцы Ул. І. Леніна і першы выпуск кнігі «Працы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску». Гэтая кніга выдадзена ў тым жа 1922 г. невялікім тыражом. Наступны (№ 2—3) выпуск «Прац Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску» таксама ёсць у бібліятэцы Ул. І. Леніна з кароткім надпісам на тытульным лісце: «Ул. І. Леніну ад БДУ». Гэты выпуск выйшаў у свет 30 кастрычніка 1922 г.

Сярод іншых кніг у бібліятэцы Ільіча ёсць брашура С. Я. Вальфсона пра жыццё і дзейнасць Г. В. Пляханава «Вялікі сацыяліст», выдадзеная ў 1922 г. ў Мінску і 2-е выданне кнігі таго ж аўтара «Дыялектычны матэрыялізм», якая ўяўляе сабою курс лекцый, прачытаны на факультэце грамадскіх навук БДУ. Ёсць там і «Нарысы беларускай літаратуры» прафесара БДУ М. А. Янчука, і кнігі рэктара БДУ прафесара В. І. Пічэты, і дзве кнігі М. М. Нікольскага.

У 1923 г. у Мінску быў выдадзены зборнік артыкулаў выдатнага нямецкага публіцыста сацыял-дэмакрата Франца Мерынга пад назвай «На філасофскія і літаратурныя тэмы». Пераклаў артыкулы з нямецкай на рускую мову беларускі мастацтвазнаўца М. М. Шчакаціхін. Уступны артыкул да зборніка напісаў С. Я. Вальфсон. Гэтая кніга таксама ёсць у бібліятэцы Ул. І. Леніна.

М. КАМІНСКІ.



У мінулую нядзелю на сустрэчу з пакупнікамі, прысвечаную 20-годдзю перамогі над фашысцкай Германіяй, у Цэнтральны кніжны магазін Мінска прыйшлі пісьменнікі І. Шамякін, І. Навуменка, Я. Скрыган, К. Кірэенка, Е. Лось, Ул. Надзведскі, А. Вольскі. Пісьменнікі выступалі перад пакупнікамі, чыталі свае вершы, давалі аўтографы.

Гэты здымак зроблены нашым фотакарэспандэнтам у час сустрэчы.

Фота Ул. КРУКА.

Сярод кніг

ПЕРАМОГА КАВАЛАСЯ Ў БАРАЦЬБЕ

Пра барацьбу савецкага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікамі створана багатая і разнастайная літаратура. Але попыт на яе не змяншаецца, яна працягвае раскрываць усё новыя і новыя староны народнага подзвігу.

З цікавасцю бярэш кнігу аб падполлі Віцебска — вялікага горада «на поўначы Беларусі, на беразе шырокай і маляўнічай ракі». Яе аўтар Рыгор Няхай паказвае невялікі адрэзак часу, некалькі тыдняў, калі ў падполлі працавала Ганна Сяргееўна Карнілава — Вера Харужая. Аб тым, што прататыпам Карнілавай з'явілася Вера Харужая, паведамляецца ў анатацыі, якая, дарэчы, змешчана чамусьці на супервокладцы і разам з апошняй знікне, калі два-тры разы пабудзе ў руках чытачоў. Выдаўцы, шыкоўна апрануўшы кнігу, зрабілі чытачу (ды і аўтару) мядзведжую паслугу, бо для таго, хто возьме кнігу без супервокладкі (а значыць і анатацыі) многае будзе няясна. Стане незразумелым, напрыклад, чаму ў кнізе скарыстаны шматлікі фактычны матэрыял — пісьмы, запіскі, успаміны, артыкулы, змешчаныя ў іншых кнігах і перыядычным друку.

Можна прадбачыць, што кніга Р. Няхая будзе мець зайздросны лёс — яна не залежыцца на бібліятэчных паліцах. У аповесці праўдзіва перададзена напружаная атмасфера лета 1941 года — упартыя баі, масавы гераізм народа. Перад чытачом праходзіць шмат дзейных асоб, але твор не здаецца «пераналселным».

Цэнтральнае месца ў аповесці займае вобраз Ганны Сяргееўны Карнілавай. Пад гэтым імем Вера Харужая пайшла ў тыл ворага. І перад аўтарам стаяла нялёгкая задача — стварыць літаратурны вобраз, не адыходзячы далёка ад прататыпа, але і не збіваючыся на пераказ багатага дакументальнага матэрыялу.

Пісьменніку ўдалося даволі шырока паказаць жыццё і барацьбу сваёй гераіні. Расказваецца пра гады юнацтва Ганны Сяргееўны, пра яе нялёгкі шлях заходнебеларускай падпольшчыцы. Барацьба за светлую будучыню чалавецтва стала сэнсам жыцця гераіні.

Ганна Сяргееўна паўстае са старонак аповесці як верны салдат партыі, умелы партыйны кіраўнік. Нязломная воля, перакананасць, цвёрдая вера ў перамогу вядуць яе на першую лінію барацьбы. Вопытны канспіратар-падпольшчык, у акупіраваным горадзе яна адразу ж наладжвае яўкі, згуртоўвае патрыётаў, збірае агентурныя звесткі аб ворагах. Яна змагаецца з ворагам усімі магчымымі сродкамі. І калі Ганне Сяргееўне прапануюць часова пакінуць горад, яна рашуча адказвае: «А што сказалі б пра салдата, які ўцёк бы з поля бою, бо там страшна, бо там яго пільнуе смерць. Выйсці з горада — гэта значыць адступіць. А я не адступлю...» Моцная любоў да жыцця спалучаецца ў яе з самаахвярнасцю, гатоўнасцю кожную хвіліну аддаць жыццё ў імя Радзімы. Выпрабаваны, бясстрашны змагар, яна да канца прайшла суровыя выпрабаванні, вынесла страшэнныя катаванні... Усхвалявана, з глыбокім аўтарскім болем гучаць старонкі аповесці аб апошніх днях Ганны Сяргееўны.

Праўдзіва паказана ў творы барацьба ва ўмовах падполля, удала намаляваны многія вобразы. Запамінаюцца самаадданыя сувязныя Бяроза і Дуся, захапляе подзвіг простай сям'і Верабь'ёвых, якія загінулі, не выдаўшы ворагам нікога са сваіх таварышаў. Цікава намечаны вобраз Меднага, кіраўніка падполля. Ён вопытны, энергічны. Праўда, пра яго хацелася б даведацца больш, бо гэта фігура выключная, але занадта акружаная арэолам таямнічасці. Псуе ўражанне і бравада Меднага, яго схільнасць да гучных слоў.

Паказвае Р. Няхай у творы і ворагаў — фашыстаў і розных здраднікаў, накшталт былога следчага пракуратуры Пятрова, які з часоў калектывізацыі затаіў злосць на Савецкую ўладу і чакаў толькі зручнага моманту, каб пачаць помсціць. Аўтар падкрэслівае, што гэта вораг хітры, небяспечны і змагацца з ім цяжка.

Аповесць не пазбаўлена недахопаў, якія тлумачацца, як мне здаецца, аўтарскай паспешлівасцю. Так, дзіўныя «метамарфозы» адбываюцца з падпольшчыцай Галяй. Спачатку пра яе ідзе гутарка як пра дарослую дзяўчыну, а праз 10—12 гадоў, напярэдадні вайны, яна ператвараецца ва «ўчарашнюю дзесяцікласніцу». А што гэта адна і тая ж Галя, аўтар пацвярджае на старонцы 231.

Нямала ў кнізе супярэчнасцей, якія тлумачацца проста аўтарскай няўважлівасцю. На старонцы 179, напрыклад, аўтар піша, што Ганна Сяргееўна забараніла ўзрываць «народны дом», бо там будзе шмат жыхароў горада. Падпольшчыкі згадзіліся. А праз некалькі старонак у «народным доме» чуваць стрэлы і рвуцца гранаты падпольшчыкаў.

Лішнімі здаюцца прыгодніцкія староны — пра сустрэчы Ганны Сяргееўны з правакатарам Рэкшам у пачатку 20-х гадоў, а пасля пра амаль адначасовае іх з'яўленне ў Віцебску. Да таго ж вельмі дзіўна паводзіць сябе Рэкша — то пазнае Ганну Сяргееўну на фотаздымку, то не пазнае ў твар і прапануе нават выпусціць, то на наступнай старонцы зноў пазнае. Парушаецца ўсялякая логіка рэчаў.

Вельмі просталінейнае выкарыстанне малюнкаў прыроды як сімвалаў. Таму яны выглядаюць наўмыснымі і ненатуральнымі.

Месцамі Р. Няхай збіваецца на сухасць і пратакольнасць мовы, часам ужывае танныя эфекты або такія «прыгажосці»: «Цяпер шчокі яе абвялі, як тыя вяргіні, прыхопленыя марозам»...

Гэтыя недахопы, безумоўна, псуюць уражанне ад твора. Але кніга, думаецца, з цікавасцю будзе сустрэта чытачамі. І добра, што выйшла яна напярэдадні слаўнай гадавіны — 20-годдзя з Дня перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яна разгортвае перад намі яшчэ адну незабыўную старонку гераічнай барацьбы беларускага народа за сваю свабоду і незалежнасць.

Г. ЮРЧАНКА.

Рыгор Няхай. «Героі не адступаюць». Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1965 г.

Выйшлі з друку

АДРАСУЮЦЦА ПІСЬМЕННІКУ, ЖУРНАЛІСТУ, НАСТАЎНІКУ

Выдавецтва «Навука і тэхніка» штогод выпускае па некалькі маўразнаўчых прац.

Зараз рыхтуецца да друку кніга **«Аб некаторых асаблівасцях беларускай літаратурнай мовы».** Тут закранаюцца важныя пытанні культуры нашай мовы — аб унармаванні напісання геаграфічных назваў, аб удасканаленні некаторых правіл беларускай пунктуацыі і ліквідацыі пунктуацыйнага разнабою, аб правільным ужыванні абрэвіятур. Сур'ёзная размова вядзецца аб культуры вуснай мовы беларускага радыё, тэлебачання, тэатраў.

Кніга адрасуецца не толькі спецыялістам-мовазнаўцам, але і шырокім колам грамадскасці — пісьменнікам, журналістам, настаўнікам.

Неўзабаве выходзіць у свет кніга А. Міхневіча **«Сінтаксічна непадзельныя словазлучэнні ў беларускай мове (трансфармацыйны аналіз)».** Гэтая праца прысвечана аднаму з цікавейшых і ў той жа час мала распрацаваных пытанняў сінтаксісу. Тут упершыню на беларускім матэрыяле прымяняецца метад трансфармацыйнага аналізу, таму кнігу можна разглядаць як пэўны ўзор для стварэння сістэмнага апісання сінтаксісу беларускай мовы.

Чытачы таксама неўзабаве здолеюць пазнаёміцца з кнігай М. Бірылы **«Беларускія антрапанімічныя назвы»,** у якой на багатым фактычным матэрыяле вызначаюцца заканамернасці ўтварэння беларускіх прозвішчаў. Аўтарам сабран і абагульнен надзвычай цікавы матэрыял па гісторыі беларускай антрапанімікі. Асобна разглядаюцца розныя тыпы прозвішчаў — первічныя, другасныя, складаныя.

Слова бярэ чытач

СУЧАСНІК У САЛДАЦКІМ ШЫНЯЛІ

Сёлета ў Маскве, у выдавецтве «Детская литература», выйшла невялікая кніжка В. Хомчанкі «Ваенны гарадок». У ёй пісьменнік па-ранейшаму расказвае пра нашых воінаў, пра іх бачную вучобу і адпачынак, пра гатоўнасць чалавека ў шынялі памагаць людзям.

Героям многіх апавяданняў, сабраных у кнізе, аўтар часам не дае нават імя. Проста сапёры, рызыкуючы жыццём, абясшкодзілі міну, знойдзеную пад школай («Дом пад сінім дахам»); проста воіны выкапалі калодзеж, і людзі, п'ючы ваду, яго называюць «салдацкім» («Салдацкі калодзеж»); воін-сувязіст дапамог людзям, якія чакалі аўтобуса, раскласці касцёр («Касцёр»); і г. д. Чытаеш гэтыя невялікія апавяданні-сцэнкі і прыходзіць думка: раз такія людзі стаяць на варце нашай краіны, дзеці могуць спаць спакойна, іх сон не парушаць ворагі.

Цікава і лёгка чытаецца і маленькая аповесць «Ваенны гарадок», якая дала назву кніжцы. Пісьменнік паказаў сябе тут добрым знаўцам душы дзіцяці, яго псіхалогіі. Маленькі Вова, які прыязджае да бацькі-дэсантніка ў ваенны гарадок, шмат думае над падзеямі, што здараюцца навакол, стараецца асэнсаваць іх, робіць свае вывады. У хлопчыка ўзнікае імкненне вызначыць сваё месца ў жыцці.

М. ВОІНАЎ,
студент Гомельскага педагагічнага інстытута.

УНІВЕРСІТЭТЫ АБМЯНЯЛІСЯ ГАЗЕТАМІ

У пачатку мінулага месяца на кафедру партыйна-савецкага друку Беларускага дзяржаўнага універсітэта прыйшло пісьмо. Пісалі выкладчыкі і студэнты факультэта журналістыкі Львоўскага універсітэта. Яны цікавіліся жыццём будучых беларускіх журналістаў і выказвалі пажаданне абмяняцца нумарамі вучэбных газет.

Прапанова ўсім спадабалася. Была створана спецыяльная рэдакцыя. Неўзабаве «нумар дружбы», як назвалі яго ва універсітэце, быў гатовы. Артыкулы, замалёўкі, здымкі расказалі пра жыццё, вучобу і адпачынак студэнтаў, пра іх удзел ў перыядычным друку, пазнаёмілі украінскіх сяброў з літаратурнай творчасцю будучых журналістаў.

Львоўскія студэнты паведамілі, што газету з цікавасцю сустрэлі ў іхнім універсітэце. Хутка ў Мінск прыйдзе абменны нумар ад львоўчан.

П. ЛІПАЙ.

АГЛЯД АРМЕЙСКІХ КАЛЕКТЫВАЎ

У Маскве праходзіць агляд самадзейнага драматычнага мастацтва савецкіх воінаў, прысвечаны 20-годдзю перамогі над фашысцкай Германіяй.

За права ўдзельнічаць у заключным этапе агляду змагаліся 52 аматарскія калектывы Савецкай Арміі. Як расказаў нашаму маскоўскаму карэспандэнту намеснік старшыні журы агляду Ю. Кучараў, народны тэатр Бабруйскага Дома афіцэраў—адзін з дзесяці лепшых армейскіх самадзейных калектываў, запрошаных у сталіцу, каб паказаць сваё майстэрства.

18 красавіка Бабруйскі тэатр (кіраўнік — заслужаны дзеяч культуры БССР Ул. Карпаў) паказаў на сцэне Цэнтральнага тэатра Савецкай Арміі спектакль «Крэпасць над Бугам» па п'есе С. Смірнова. Мяркуецца сустрэча ўдзельнікаў гэтай пастаноўкі з аўтарам п'есы. Бабруйчане паглядзяць у тэатры Савецкай Арміі спектакль «Настаўнік танцаў», а таксама сустрэнуцца з калектывам Дзяржаўнага акадэмічнага Малога тэатра.

Журы агляду, у склад якога ўваходзяць відныя майстры савецкай сцэны, адбяруць лепшыя сцэны з самадзейных спектакляў для заключнага канцэрта, што адбудзецца 8 мая ў Палацы з'ездаў.

РЭКАМЕНДАЦЫІ, ПРАПАНОВЫ, ЗАЎВАГІ

Днямі ў Маскве пад старшынствам літаратуразнаўцы Я. Мазалькова адбылося чарговае пасяджэнне савета па беларускай літаратуры Саюза пісьменнікаў СССР. Ад беларускіх пісьменнікаў у ім прынялі ўдзел П. Глебка, Ул. Дубоўка, І. Навуменка, Р. Бярозкін, І. Шамякін, А. Міронаў, Я. Казека і А. Кучар.

На савеце былі заслуханы паведамленні старшыні секцыі прозы Саюза пісьменнікаў БССР І. Навуменкі і крытыка Р. Бярозкіна. І. Навуменка гаварыў пра навінкі беларускай прозы, пра новыя раманы беларускіх празаікаў, а Р. Бярозкін зрабіў агляд беларускай паэзіі за апошні час, пазнаёміў членаў савета з творчасцю маладых беларускіх паэтаў, яшчэ мала вядомых усесаюзнаму чытачу.

У спрэчках прынялі ўдзел многія члены савета. Яны зрабілі рад каштоўных рэкамендацый маскоўскім выдавецтвам, гаварылі аб неабходнасці паляпшэння якасці перакладаў з беларускай мовы шляхам працягнення да гэтай справы рускіх пісьменнікаў, якія жывуць і працуюць у Мінску.

На пасяджэнні было ўзнята пытанне аб павелічэнні лістажу часопіса «Неман» і ператварэнні яго ў штомесячнае выданне. Была выказана таксама прапанова аб адкрыцці ў Маскве кнігарні «Беларуская кніга».

ТВОРЧЫ ВЕЧАР

Гэтымі днямі ў Маскве, у Цэнтральным Доме работнікаў мастацтваў адбыўся творчы вечар народнага артыста БССР, кампазітара М. Аладава. Прысутныя праслухалі мантаж яго оперы «Андрэй Касценя» ў магнітафонным запісу.

Опера «Андрэй Касценя» расказвае пра барацьбу беларускіх партызан супраць фашысцкіх захопнікаў. У аснову яе лібрэта, напісанага П. Глебкам, пакладзена дзейнасць легендарнага партызанскага камандзіра Канстанціна Заслонава. Запіс мантажу оперы на магнітафонную плёнку быў зроблены Беларускім радыё ў 1959 годзе пры ўдзеле аркестра, хору і салістаў радыё, а таксама філармоніі.

На праслухоўванні «Андрэя Касцені» прысутнічалі многія відныя прадстаўнікі музычнай грамадскасці Масквы. Сярод іх дзеячы мастацтва В. Барсава, М. Максакава і іншыя. Яны адзначылі мастацкія вартасці оперы і выказалі пажаданне, каб опера была пастаўлена на сцэне.

У творчых саюзах

ВЕСНАВАЯ ВЫСТАЎКА

У салон-магазіне Мастацкага фонду БССР адкрылася веснавая выстаўка беларускай графікі. Тут работы мастакоў старэйшага пакалення — акварэлі А. Тычыны, Л. Лейтмана, пастэлі А. Марыкса, а таксама графічныя лісты маладых.

Н. Паплаўская выставіла серыю лінагравюр — ілюстрацый да рамана І. Мележа «Людзі на балоце», А. Кашкурэвіч — афорты з серыі «Іх норавы», якія характарызуюцца экспрэсіяй, добрым адчуваннем пластыкі.

Цікавыя работы М. Моўчана «Украіна», «Блізняты», В. Ткачука «Лесасплаў», «Тураўскія балоты» і інш. Мастак Л. Шчамелеў з творчай паездкі па поўначы прывёз многа партрэтаў. Праўдзіва і ў нацыянальным каларыце пададзены ў іх вобразы рыбакоў, рабочых, паляўнічых. Вылучаюцца акварэлі В. Цвірко, Я. Ціхановіча, А. Волкава.

ТЫДЗЕНЬ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

У мінулыя суботу і нядзелю ў сувязі з Тыднем выяўленчага мастацтва Саюз мастакоў правёў «Дзень адкрытых дзвярэй». У майстэрнях мастакоў пабывалі школьнікі, студэнты, рабочыя. Група школьнікаў прыйшла да графіка А. Кашкурэвіча; гутарылі ў сваёй майстэрні з гасцямі мастакі А. Паслядовіч і В. Сахненка. Студэнты Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага наведалі майстэрні жывапісца А. Шыбнёва і скульптара А. Глебава. Мастакі расказвалі пра асаблівасці сваёй работы, дзяліліся творчымі планамі.

□

Мастакоў Брэста не назавеш дамаседамі. Іх часта можна бачыць з эцюднікамі на берагах Буга і Мухаўца, у цэхах заводаў і фабрык, на будаўнічых пляцоўках, у калгасах. А ў Тыдзень выяўленчага мастацтва яны працавалі асабліва напружана.

Пабывалі ў падшэфным калгасе імя Мічурына Мікалай Дудараў і Георгій Лабакоў. Яны напісалі лозунгі, афармілі стэнды па матэрыялах санавіцкага Пленума ЦК КПСС, стварылі серыю партрэтаў перадавікоў. Такую ж работу правялі ў калгасе «Памяць Ільіча» Сяргей Рыжанкоў і Мікалай Шаўчук, у калгасе «Пагранічнік» — Леанід Салаўёў і Варвара Пабаруева, у калгасе «Маладая гвардыя» — Віктар Чарнышоў.

Многія брэсцкія мастакі падрыхтавалі цікавыя лекцыі. Васіль Шыкін расказваў пра мастакоў-перасоўнікаў, Васіль Сабалеўскі — пра жыццё і творчасць Левітана.

ПРАЕКТЫ ПОМНІКА ГЕРОЯМ

Каля ста праектаў помніка-манумента ў памяць гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці паступіла ў Саюз архітэктараў БССР. У адкрытым конкурсе, які праводзіць Дзяржбуд, Саюзы архітэктараў і мастакоў рэспублікі, удзельнічаюць творчыя работнікі Мінска, абласных гарадоў, Масквы, Ленінграда, Кіева. Першае абмеркаванне праектаў мяркуецца правесці ў Брэсце.

ДА 20-ГОДДЗЯ ПЕРАМОГІ

Саюз работнікаў кінематаграфіі БССР рыхтуецца да месячніка культурна-шэфскай работы ў часцях Савецкай Арміі, прысвечанага 20-годдзю перамогі над фашысцкай Германіяй. Месячнік пачнецца ў канцы красавіка. Групы творчых работнікаў пабываюць у воінскіх падраздзяленнях. Яны выступяць з лекцыямі «Вырыццё фашызму ў кіно», «Роля кіно ў Вялікай Айчыннай вайне» і «Вобраз сучасніка ў кіно».



З малюнкаў мастака Г. Скамарохава да кнігі Ганны Мушынскай-Гофман «Вера і яе таварышы», якая выходзіць у выдавецтве «Беларусь».

СТАРШЫНЯ САЎНАРКОМА

Павел КАБЗАРЭЎСКІ

Ленінградскі пісьменнік Павел Кабзарэўскі, вядомы нашаму чытачу, як перакладчык многіх беларускіх твораў, прапануе газеце ўрывак з рамана, над якім зараз працуе. «Раман «Краіна ў агні», — расказвае аўтар, — прысвечаны грамадзянскай вайне ў Сібіры. Дзеянне рамана адбываецца ў 1919—20 гадах, калі маладая Савецкая рэспубліка, акружаная ворагамі, прыкладала тытанічныя намаганні да разгрому калчакоўшчыны...»

УРЫВАК З РАМАНА

ЧАС АД ЧАСУ ў кабінеце старшыні Саўнаркома званіў тэлефон. Сакратар, адрываючыся ад незлічонай карэспандэнцыі, здымаў трубку і слухаў нервовую пульсацыю мембраны.

— Хто гаворыць? Ало. Таварыш Дзяржынскі... Уладзіміра Ільіча няма. Так, так, вядома. Хутка будзе.

У прасторным будынку Судовых устаноўленняў, дзе знаходзіўся Саўнарком, работа, нягледзячы на позні час, не спынялася. Да людзей у фрэнчах і зашпіленых наглуха гімнасцёрках падступала стома, але яны бачылі перад сабой усю краіну, якая знемагалася ад нечалавечага напружання, і разумелі, што ў гэтыя дні нельга і думаць аб адпачынку. Кур'еры ў латаных пінжаках чакалі ў калідорах, снавалі па лесвіцы.

Сакратар вяртаўся зноў да карэспандэнцыі і, разбіраючы яе, прыслухоўваўся да шуму за вокнамі, да рэзкіх аўтамабільных і заводскіх гудкоў. Ён добра ўяўляў, чым жыве зараз Масква. На Бранскі, Курскі і іншыя вакзалы спяшаліся, азіраючыся па баках, мяшэчнікі. На Тэатральнай плошчы гарэлі агні, і коні з упалымі бакамі і праступаўшымі рэбрамі прагна жавалі сена. Трамваі хадзілі рэдка, не па ўсіх лініях. Помнікі, здавалася, былі больш строгімі, больш задуменнымі...

...Старшыня Саўнаркома, аб'язджаючы ўскраіны, заходзіў у цэхі і рабочыя кватэры. Ён бачыў няўцепленыя карпусы, паўгалодных рабочых, бачыў хворых жанчын і дзяцей, што грызлі, як ласунак, сухія аўсяныя праснакі і пілі смярдзючы цыкорый з сахарынам. Ён заўважаў усё, нават тапоў і тараканаў, якія шамацелі па ірваных шпалерах, пабляклую, забытую герань на падаконніках.

Ленін проста вітаўся з людзьмі, цікавіўся іх справамі, іх жыццём і здароўем. І калі ён пачынаў гаварыць, усе адчувалі: гэта аб самым галоўным. Людзі глыбока верылі ў яго, ведалі, што гэты чалавек з праніклівымі жывымі вачамі, скупымі жэстамі і спагадлівым голасам,— іх лепшы друг...

Старшыня Саўнаркома выходзіў пад прывітальныя воклічы тэкстыльшчыкаў, якія праводзілі яго за вароты. Гіль, у чорнай скуранай куртцы, з наганам у кішэні, завёў машыну і паглядваў па баках. Ён ужо вывучыў найбольш бяспечныя маршруты, і кожны раз сэрца яго ўздрыгвала, калі ён бачыў падазроную групу людзей, ці стаяўшы на дарозе незнаёмы аўтамабіль. Шафёр меў падставы баяцца. Ен сам бачыў жанчыну з фанатычным бляскам у вачах і доўгімі растрэпанымі валасамі, жанчыну, якая зусім нядаўна раніла Леніна на заводзе Міхельсона. Помніў Гіль і тое, як стралялі ў Леніна, калі ён ехаў па Петраграду разам са швейцарскім камуністам Платанам. Платан тады загарадзіў Леніна сваім целам, а Гіль імгненна перавёў машыну на гранічную хуткасць. І, можа быць, толькі яго хладнакроўе выратавала ў той дзень Леніна ад эсэраўскай кулі...

Аўтамабіль праязджаў паўз вялікую пустку. Ленін нечакана папрасіў спыніць машыну. Шафёр, недаўмяваючы, перавёў рычаг. Ільіч вышаў з аўтамабіля і хуткімі крокамі накіраваўся да пусткі. Падышоўшы да вялікага заснежанага грудка, пачаў разглядваць нейкія металічныя абломкі і стружкі.

— Гэта алюміній, ці не праўда, таварыш Гіль?— спытаў Уладзімір Ільіч.

Гілю не раз прыходзілася мець справу з гэтым металам, і ён адразу пазнаў яго.

— Вось бачыце! — узрадаваўся Уладзімір Ільіч.

Ен дастаў запісную кніжку і чыркнуў у ёй адну фразу. Затым яны паехалі далей...

Нягледзячы на свае сорак восем гадоў Уладзімір Ільіч хутка ўздымаўся па лесвіцы. Сакратар, пазнаўшы здалёку яго крокі, выйшаў насустрач. Ленін спыніўся ля дзвярэй прыёмнай.

— Усё, што датычыць Усходняга,—дакладваў сакратар,— падрыхтавана.

— Добра. Цяпер пастарайцеся выклікаць Бруевіча.

Сакратар на мінуту затрымаўся.

— Апошнія, Уладзімір Ільіч, паведамленні аб Пермі. Тэлеграма ў вас на стале, у папцы тэрміновых.

Голас сакратара задрыжэў.

— Пра падзенне Пермі мне ўжо вядома, — Ленін накіраваўся ў кабінет. — Выклікайце Бруевіча.

У кабінеце вісеў вялікі партрэт Маркса. Вакол доўгага стала размясціліся ў два рады гнутыя венскія крэслы. Самы строгі позірк не мог бы знайсці ў пакоі нічога лішняга.

Уладзімір Ільіч прабягаў паперы, затрымліваючыся на некаторых. Рабіў то там, то тут адзнакі. У паперах гаварылася аб Чырвонай Арміі. Аб апошніх дыпламатычных нотах. Аб падзяжы жывёлы. Аб абутку. Аб бакінскай нафце. Тут былі дэкрэты аб хлебе, аб зямлі, аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і аператыўныя зводкі. Свет ляжаў перад старшынёй Саўнаркома на стале, як знаёмая, раскрытая кніга...

Кабінет напаўняўся вайсковымі. Вячэрняе святло сцякала па іх шэра-зялёных фрэнчах і чорных пінжаках Леніна і Бонч-Бруевіча.

— Як гэта атрымалася, як гэта магло атрымацца, — гаварыў, адтапырваючы па звычцы два пальцы правай рукі, Уладзімір Ільіч. Пытання не было. Быў строгі, бязлітасны дакор.

Вайсковы з адточанымі вусамі, што сядзеў ля самага стала, устаў.

— Таварыш Ленін. Трэцяя армія зрабіла ўсё, што змагла зрабіць. Але яна, пазбаўленая дапамогі, была ўшчэнт дэмаралізавана. Да гонару арміі трэба сказаць, што яна нават ва ўмовах холаду, голаду, вялікай расцягнутасці, зрабіла рад адказных і ў той жа час вельмі прыгожых аперацый.

Ленін таксама ўстаў і пагладзіў сукно стала.

— Апошняе не істотна. Няважна, як мы разаб'ем Калчака, прыгожа ці не прыгожа, абы толькі разбіць. Зразумела, на адну трэцюю армію няма чаго ўсе шышкі валіць. Уладзімір Дзмітрыевіч,— Ленін павярнуўся да Бонч-Бруевіча,—і вы,— ленінскі палец скіраваўся да мажнага, туга перацягнутага папругай вайсковага,— трэба праверыць, ці дастаткова энергічна дае глаўком падмацаванне ўсходняму фронту. Празяваць такія рэчы — злачынства.

Сакратар Ваенна-рэвалюцыйнага Савета і мажны вайсковы маўкліва кіўнулі галовамі. Затым вайсковы сказаў:

— Есць меркаванне ўвогуле не спяшацца з Уралам і Сібірам. Маецца на ўвазе рубеж ракі Белай. Праўда, гэта меркаванне яшчэ...

Ленін нахмурыўся. Ваенны ўбачыў гэта і замоўк.

— Гэта авантурызм, ні больш, ні менш. Зрэшты, — Уладзімір Ільіч панізіў голас,— аб гэтым размова будзе пазней.

Ленін з вайсковымі праглядаў аператыўныя зводкі. Яны заслізгалі алоўкамі па карце-двухвёрстцы, вызначаючы мясцовасць хутка і дакладна, да апошніх вёсачак і рачулак.

— Глядзіце, вось пункт з трывалай прыроднай абаронай, вялікімі манеўранымі магчымасцямі. А насельніцтва?.. — памяць у тую ж хвіліну давала патрэбную даведку.— Ага. Скрозь рабочыя, з невялікай праслойкай саматужнікаў. Часці будуць адчуваць сябе, як дома. Фуражныя, піщэвыя базы. Жылы фонд. Цудоўна.

— Цудоўна, — паўтарыў Ленін, засоўваючы рукі ў кішэні пінжака. — Цяпер пытанне: з якіх франтоў, без адчувальнай шкоды, можна ўзяць хоць крыху сіл для Усходу. Уладзімір Дзмітрыевіч, з Паўднёвага і Паўночнага пасля поўдня звестак не было?

Вайсковыя запісвалі і чулі голас Леніна:

— З дакладнай выбаркай, колькі штыкоў і шабель. Рухомы састаў, ступень падрыхтаванасці войск...

Выходзячы з крамлёўскага будынка са старажытнымі франтонамі, на якіх мароз маляваў аднаму яму вядомыя карціны, вайсковыя маўчалі. Але гэтае маўчанне было красамоўным...

...Уладзімір Ільіч працаваў да позняй ночы. Франты, франты, франты... На Доне, пад Архангельскам, у Сібіры, на Украіне чырвонаармейцы ідуць па глыбокім снезе, скрозь пургу, уступаюць у кароткія штыкавыя баі з ворагам, падаюць пад разрывамі снарадаў. Яны, што абараняюць рэвалюцыю, зараз як бы прысутнічалі ў кабінеце старшыні Саўнаркома. Ен бачыў густы пушысты снег на іх ботах, маладыя твары, пакрытыя шэранню.

Уладзімір Ільіч занёс аловак, і яны скіраваліся да замёрзлай Камы з прыстанямі і параходамі, пад Перм, на маставых якой яшчэ грукаталі варожыя часці.

Ленін спісаў шматлікімі знакамі карту Усходняга фронту. Прагледзеў зводкі іншых франтоў і зноў пачаў пісаць. Воінскія злучэнні перамяшчаліся, перакідваліся, цягнуліся адно да аднаго, раслі лічбы часцей і шабель. Падмацаванне Усходняму знаходзілася...

...Уладзімір Ільіч выцер насоўкай лоб. Дастаў з бакавой кішэні запісную кніжку. Знайшоў патрэбны запіс, і на чыстым бланку ламаным пахілым почыркам накідаў пісьмо. Уверсе паставіў: «Неадкладна», а ўнізе — «Выканаць і вынікі данесці». Прамакальная папера хутка ўсасала фіялетавае чарніла. Заўтра людзі прачытаюць пра сваю нядбайнасць, і той алюміневы грудок адразу зменшыцца. Пройдзе тыдзень — і на закінутым двары алюмінія не будзе зусім.

Ен узяў пісьмо і хутка прайшоў да сакратара. Вочы таго былі чырвоныя, запалёныя ад бессані.

— Вазьміце,— Ленін працягнуў пісьмо,— і адпраўце заўтра раніцай у Савет Народнай гаспадаркі. Ніякая ведамасная мітусня ў гэтай справе нецярпімая. Цікаўцеся лёсам пісьма... Потым — вам трэба выспацца. Едзьце дамоў зараз жа. Калі машын свабодных у гаражы няма, бярыце маю.

«А самі, самі вы, Уладзімір Ільіч, калі вы будзеце адпачываць? Усё пра другіх клапоціцеся»,— хацелася сказаць сакратару, але ён прамаўчаў. Зачыніў шуфляду стала, звязка ключоў бразнула, апускаючыся ў кішэню. Цяжка ўстаў і, хістаючыся, выйшаў, пажадаўшы Леніну спакойнай ночы.

Але спакойнай ночы ў Леніна не было...

Пераклад з рускай мовы.

Каля 40 назваў вырабаў з кераміні выпускаюць мастацка-вытворчыя майстэрні горада Барысава. Іх можна сустрэць у магазінах Мінска, Масквы, а таксама многіх братніх рэспублік. Цяпер калектыў майстэрань рыхтуе ўзоры сваёй прадукцыі ў Маскву на выстаўку выпуўленчага мастацтва.

На здымку — фармоўшчыца мастацкіх вырабаў камуніст Роза Андрэеўна Вайцяхоўская апрацоўвае новыя ўзоры вазонаў. Фота П. НАВАТАРАВА. (БЕЛТА).

ПЕСНІ МАЛАДОСЦІ

МУЗЫКА АЛЯКСАНДРЫ ПАХМУТАВАЙ

Шмат прыхільнікаў творчасці Аляксандры Пахмутавай сярод моладзі і студэнтаў розных краін свету. Гэта зразумела, бо іменна маладосць і ўсё, што ёй уласціва — каханне, натхнёная праца, рамантыка, адвага, імкненне да шчасця і братэрства, з'яўляецца галоўнай тэмай музыкі кампазітара.

Песні А. Пахмутавай эмацыянальныя, яны вабяць прастатой і яснасцю меладычнай мовы. Яны сучасныя, і не толькі па змесце, але і па сваёй музычнай форме. Таму, хто чуў песні пра трывожную маладосць, пра Ангару, «Куба—любоў мая», «Паходная кавалерыйская», ясна, што іх стварыў мастак, які падхапіў самыя хвалюючыя тэмы і самыя дакладныя інтанацыі свайго пакалення.

Мы папрасілі А. Пахмутаву расказаць пра сябе, пра свае творчыя планы. Але сустрэцца з ёю аказалася не так проста. Гэтая мініяцюрная 35-гадовая бялявая жанчына з яснымі вачыма і адкрытай усмешкай такая ж мэтаімкнёная, энергічная і напружана-дзейная, як героі яе песні. Апошні час А. Пахмутава была занята ў кіно. Музыка да фільма «Жылі-былі старыя са старою», здымкі якога закончыў нядаўна на студыі «Масфільм» кінарэжысёр Рыгор Чухрай, напісана ёю.

— Мой шлях у музыку,— сказала Аляксандра Пахмутава,— просты і звычайны. Дзяцінства на Волзе, дае любяць песню і ўмеюць спяваць так, нібы радуецца або плача душа. Цэнтральная музычная школа пры Маскоўскай кансерваторыі, потым кансерваторыя, аспірантура. Да таго часу я ўжо напісала «Рускую сюіту» для аркестра і канцэрт для трубы з аркестрам і рабіла тэарэтычную работу аб партытуры оперы М. Глінкі «Руслан і Людміла».

Але асабліва мяне вабіла да песні. А тут, якраз пасля сканчэння кансерваторыі, мне прапанавалі напісаць песню для радыёпастаноўкі, я згадзілася і зрабіла гэта вельмі хутка.

Работа ў кіно — музычнае афармленне фільмаў «Сям'я Ульянавых», «Дзяўчаты», «Яблык разладу» і, нарэшце, «Па той бок» асабліва парадніла мяне з гэтым любімым мною жанрам. А «Песня аб трывожнай маладосці», якая пайшла з фільма ў вялікае самастойнае жыццё, нібы зацвердзіла мяне ў праве і надалей працаваць у песенным жанры.

Вядома, я складаю не толькі песні. За гэтыя гады напісаны дзве кантаты для дзіцячага хору з аркестрам («Ленін у сэрцы ў нас» і «Чырвоныя следапыты»), некалькі п'ес для аркестра, накцюрн для валторны з фартэпіяна, п'есы для голасу з фартэпіяна, кантата для хору з аркестрам «Васіль Цёркін» на словы Твардоўскага і многае іншае. Але асноўнае месца ў маёй творчасці займаюць, безумоўна, песні.

— Якая з вашых творчых паездак па СССР пакінула ў вас найбольшае ўражанне?

— Усе, — адказала Пахмутава. — Хіба можна забыць хоць адну з іх! У 1962 годзе я пабывала ў Сібіры, у Брацку, Ангарску, Усоллі, Іркуцку, Улан-Удэ. Якія людзі там жывуць! Якія героі! Прычым яны нават самі не разумеюць, якія яны героі. Праз непраходныя лясы, праз тайгу яны пракладваюць дарогі, будуюць электрастанцыі, гарады, заводы. Умовы жыцця там даволі суровыя, але каб вы бачылі, як любяць гэтыя людзі сваю справу, колькі мужнасці праяўляюць яны кожны дзень, кожную гадзіну.

Пасля вяртання я напісала цыкл песень «Таежныя зоркі».

А летась я паехала зноў у Сібір, у раён Усць-Іліма, дзе сёння будуецца такая ж магутная ГЭС, як і на Ангары.

Наша брыгада ехала на баржы ўздоўж ракі Ілім. Ехалі мы па ўсёй трасе пракладваемай там дарогі і ля кожнага жылля давалі канцэрты. Іншы раз нас слухала 300 чалавек, а іншы раз і 15. Будаўнікі сустракалі нас з распасцёртымі абдымкамі: тут жа распальвалі вогнішчы, нашу «сцэну» на баржы, дзе стаяла піяніна, асвятлялі з берагу пражэктарамі.

Якія мае творчыя планы? Па-першае, у мяне ёсць даўні доўг перад сабою — закончыць сімфонію. Ну, а пасля буду пісаць песні пра маіх аднагодкаў, іх старэйшых і малодшых братоў, пра тых, хто малады душою, хто закаханы ў жыццё, хто шукае, змагаецца, перамагае. Гэта — тэма невычэрпная.

Д. СЯРГЕЕВА.
(АДН).

Дзмітрый ПАЛІТЫКА

Пасля цяжкай і працяглай хваробы 18 красавіка памёр вядомы літаратурны крытык і літаратуразнаўца, дацэнт Мінскай Вышэйшай партыйнай школы Дзмітрый Антонавіч Палітыка.

Дзмітрый Палітыка нарадзіўся 15 мая 1915 г. у сям'і селяніна-бедняка вёскі Гарывец Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці. Педагог па адукацыі, ён доўгія гады працаваў у вясковых школах, у Полацкім і Магілёўскім педтэхнікумах, у Магілёўскім педінстытуце. У дні Вялікай Айчыннай вайны займаўся педагагічнай працай у савецкім тыле.

У 1950 годзе Д. Палітыка заканчвае Акадэмію грамадскіх навук і абараняе кандыдацкую дысертацыю. Пасля гэтага ён працуе выкладчыкам і загадчыкам кафедры Мінскай вышэйшай партыйнай школы.

Літаратуразнаўчую і крытычную дзейнасць Д. Палітыка пачаў у 1932 годзе. Да найбольш грунтоўных яго работ належаць даследаванне «Янка Купала — перакладчык «Слова аб палку Ігаравым», даследаванні пра М. Я. Салтыкова-Шчадрына, пра раман А. І. Ганчарова «Абрыў», пра многія творы беларускай літаратуры.

Памяць аб вучоным-камуністе, даследчыку-літаратуразнаўцы Д. А. Палітыку назаўсёды захаваецца ў сэрцах усіх, хто яго ведаў.

Праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі. Дырэкцыя, партком і мясцком Мінскай Вышэйшай партыйнай школы.

КРЫЛЫ БРАЦКАЙ ДРУЖБЫ

21 красавіка 1945 года... Дзень гэты добра памятны і савецкім людзям і палякам. Яшчэ клубіўся горкі дым вайны, Савецкая Армія дабівала фашысцкага звера ў яго логаве і на заходніх межах Польшчы, а ў Маскве сабраліся члены Савецкага ўрада і прадстаўнікі новай польскай улады. Тут быў падпісаны Дагавор аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Савецкім Саюзам і Польскай Народнай Рэспублікай.

І вось мінула ўжо дваццаць гадоў. Савецка-польскі дагавор вытрымаў выпрабаванне часам, пераканаўча паказаў жыццёвую сілу савецка-польскай дружбы.

Сапраўдная дружба не мае тэрмінаў. Яна павінна і далей мацнець і развівацца. Здзяйсняючы шчырае жаданне савецкага і польскага народаў, прадстаўнікі дзвюх сацыялістычных краін 8 красавіка 1965 года падпісалі ў Варшаве новы Дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе, тэрмінам таксама на дваццаць гадоў.

З гэтага выпадку Першы сакратар ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнеў, выступаючы на мітынгу польска-савецкай дружбы ў Варшаве, сказаў: «Сёння, гаворачы вобразна, мы стаім ля калыскі новага Дагавору. Як пражыве свае 20 гадоў новы Дагавор? Мы ўпэўнены: «нованароджаны» не толькі пойдзе па слядах «старэйшага брата», але і пераўзыйдзе яго!»

Побач з дзяржаўнымі органамі ўсё большую ролю ў развіцці і ўмацаванні сяброўскіх і культурных сувязей адыгрываюць грамадскія арганізацыі. Вялікую работу па пашырэнню такіх сувязей паміж беларускім і польскім народамі праводзіць Беларускае аддзяленне Таварыства польска-савецкай дружбы. У рэспубліцы працуюць таксама тры абласныя, чатыры раённыя і дваццаць шэсць аддзяленняў Таварыства савецка-польскай дружбы на прадпрыемствах, у калгасах, вышэйшых навучальных установах, школах.

Беларускае аддзяленне Таварыства савецка-польскай дружбы сумесна з Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі толькі летась паслала Таварыству польска-савецкай дружбы і іншым арганізацыям ПНР больш паўтары тысячы экземпляраў кніг і брашур беларускіх аўтараў, 16 фотавыставак, дзве копіі дакументальнага кінахроніка «Навекі ў дружбе», 20 артыкулаў і іншыя інфармацыйныя матэрыялы, што расказваюць пра гаспадарку і культуру Беларусі.

Паміж БССР і ПНР праводзіцца шырокі абмен дэлегацыямі, турысцкімі групамі, спартыўнымі камандамі і калектывамі мастацкай самадзейнасці. Толькі летась у Беларусь з Польшчы прыязджала звыш тысячы чалавек у складзе 26 дэлегацый, 17 турысцкіх груп і трох паяздоў дружбы.

Летась у Беларусі шырока адзначалася 20-годдзе Польскай Народнай Рэспублікі. Былі праведзены Дні польскай культуры ў БССР, прысвечаныя святу народнай Польшчы. У Мінску, ва ўсіх абласных цэнтрах, на прадпрыемствах і ў арганізацыях, у дамах культуры гарадоў і вёсак прайшлі вечары савецка-польскай дружбы, лекцыі, даклады і гутаркі аб ПНР. У піянерскіх лагерах і школах адбыліся ўрачыстыя піянерскія лінейкі і ранішнікі. У бібліятэках і кніжных магазінах былі арганізаваны выстаўкі кніг польскіх аўтараў. У кінатэатрах прайшлі фестывалі польскіх фільмаў. Беларускае радыё і тэлебачанне ў гэтыя дні праводзілі перадачы па спецыяльна падрыхтаваных праграмах. У парках многіх гарадоў былі наладжаны народныя гулянні, прысвечаныя 20-годдзю ПНР. А ў прыгранічных раёнах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей адбыліся масавыя мітынгі савецка-польскай дружбы, у якіх прынялі ўдзел тысячы прадстаўнікоў польскага і беларускага народаў.

У правядзенні Дзён польскай культуры ў Беларусі прынялі ўдзел пасол ПНР у Савецкім Саюзе тав. Эдмунд Пшчулкоўскі і супрацоўнікі пасольства, дэлегацыя Таварыства польска-савецкай дружбы на чале з намеснікам міністра асветы ПНР Міхаілам Гадлеўскім і спецыялізаваная турысцкая група з Польшчы.

Многае для ўмацавання савецка-польскай дружбы робяць абласныя аддзяленні ТСПД. Так, Мінскае абласное аддзяленне мае шырокую сувязь з Варшаўскім ваяводскім праўленнем Таварыства польска-савецкай дружбы, а брэстаўчане моцна сябруюць з люблінцамі — толькі летась на Брэсцкіне пабывала 14 дэлегацый з Люблінскага ваяводства.

Інстытут гісторыі АН БССР наладзіў цесны кантакт з інстытутам гісторыі Польскай Акадэміі навук, гістарычным інстытутам Пазнаньскага універсітэта імя Адама Міцкевіча і Ваенна-гістарычным інстытутам ПНР. Інстытуты абменьваюцца навуковай літаратурай, якую самі выдаюць, наладжваюць узаемныя камандзіроўкі навуковых супрацоўнікаў для работы ў архівах БССР і ПНР, сумесныя выданні і рэцэнзаванне новых работ, чытанні навуковых дакладаў і індывідуальную перапіску навуковых супрацоўнікаў. Інстытут гісторыі АН БССР і Польская Акадэмія навук сумесна з АН СССР і АН Літоўскай ССР падрыхтавалі да друку зборнік дакументаў пра паўстанне 1863 года ў Літве і Беларусі, які выйшаў у свет у снежні 1964 года. Праведзена ўжо вялікая работа па падрыхтоўцы да выдання сумесна з Ваенна-гістарычным інстытутам ПНР зборніка ўспамінаў беларускіх і польскіх партызан — удзельнікаў барацьбы супраць фашысцкіх акупантаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Мацнее братняя дружба суседзяў, шырэюць яе крылы. Адзначаючы 20-годдзе савецка-польскага Дагавору, працоўныя Беларусі шлюць братняму польскаму народу свае шчырыя сардэчныя прывітанні.

П. МАЦКЕВІЧ,
адказны сакратар Беларускага аддзялення ТСПД.

На гэтым здымку — навучэнкі Магілёўскага будаўнічага вучылішча, камсамолкі Н. Янкоўская (злева), Н. Рэнтовіч і Я. Церахова. Яны на грамадскіх асновах удзельнічаюць у абнаўленні пабудоў гарадскога парку культуры і адпачынку імя М. Горкага. Фота М. РУБІНШТЭЙНА.

ТЫДЗЕНЬ ПОЛЬСКАГА ФІЛЬМА

Заўтра спаўняецца 20 гадоў з дня падпісання Дагавора аб дружбе, узаемадапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Савецкім Саюзам і Польскай Народнай Рэспублікай.

У сувязі з гэтай датай у мінскім кінатэатры «Цэнтральны» з 19 красавіка праводзіцца Тыдзень польскага фільма. Мінчане ўбачаць ужо вядомыя масстацкія кінакарціны «Ева хоча спаць», «Дзяўчына з банка», «Асабняк на Зялёнай», «Як быць каханай».

Будзе таксама паказана новая польская кінакамедыя «Разводаў не будзе». Гэта — рэжысёрскі дэбют Ежы Ставінскага, аўтара сцэнарыяў такіх вядомых кінакарцін, як «Чалавек на рэйках», «Канал», «Героіка», «Шэсць пераўтварэнняў Яна Пішчыка» і інш.

З вялікай цікавасцю пазнаёмяцца гледачы кінатэатра «Цэнтральны» з фотавыстаўкай, якая паказвае дасягненні Польскай Народнай Рэспублікі.

УСТУПЛЕННЕ Ў КІНО

За апошні час у савецкі кінематограф прыйшло нямала маладых майстроў, да карцін якіх з увагай аднеслася гледачы. Пра найбольш цікавыя, на яго погляд, рэжысёрскія дэбюты па просьбе карэспандэнта АДН расказвае народны артыст СССР Сяргей Герасімаў.

У нашым кінематографе сёння пачае добрае ажыўленне. Цяперашні перыяд яго развіцця прыкметны перш за ўсё прыходам маладых рэжысёраў. Яны прынеслі з сабою цікавыя думкі, вобразныя ўяўленні, кіпучую энергію.

Большасць рэжысёраў, што выступілі за апошні год з дэбютам, — выпускнікі Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі, дзе яны вучыліся ў вядомых майстроў. Прыкметна тое, што ў сваіх работах яны не паўтараюць настаўнікаў, а ідуць самастойнай дарогай. І, вядома, іх творчы лёс не можа не цікавіць нас, кінематаграфістаў старэйшага пакалення.

Маладосці ўласціва даваць свае ацэнкі жыццёвым працэсам, па-свойму іх тлумачыць, шукаць новыя выразныя формы. Да гэтых пошукаў, думаецца, трэба адносіцца з добразычлівай увагай, бо гэта—развіццё жыцця.

Іменна ў такім святле хочацца глянуць на работы новага рэжысёрскага пакалення.

Сярод маладых мастакоў ёсць і больш і менш таленавітыя людзі. Маштабы іх жыццёвых уяўленняў, выразнасць мовы розныя. Аднак у большасці яны зацікаўліваюць гледача жывасцю назірання, вастрынёй бачання і прагным імкненнем да праўды. Добра, калі мастак не дазваляе сабе, каб павярхоўныя ўражанні замянілі складаны і супярэчлівы працэс развіцця жыцця.

Дзень за днём маладыя майстры адкрываюць для сябе складаныя заканамернасці кінематаграфічнага мастацтва. У розных жанрах, рознымі сродкамі выяўляюць яны ў жыцці рысы значныя, важныя — і ў прыгожым і ў брыдкім. Штосьці падтрымліваюць, супраць чагосьці змагаюцца. У сваіх карцінах яны звяртаюцца да самых розных бакоў рэчаіснасці. І часта праяўляюць здольнасць вырашаць праблемы не абстрактна, не дэкларатыўна.

У гэтым сэнсе найбольш характэрнай карцінай маладых, як мне здаецца, з'яўляецца фільм «Наш сумленны хлеб», створаны на Адэскай студыі рэжысёрамі А. І К. Муратавымі. Нягледзячы на немалыя цяжкасці ў рабоце, на складанасць працэсу, які адлюстроўваюць аўтары, яны зрабілі добрую карціну, у якой востра ставяцца важныя праблемы калгаснага будаўніцтва і барацьбы за хлеб. Гэтая рэч выпакутаваная, а не павярхоўная. Сцэнарый напісаў І. Бондзін — вельмі цікавы чалавек з нялёгкім лёсам, які многа перажыў і пазнаў у жыцці.

Услед за гэтай работай, напэўна, можна назваць фільм Э. Клімава «Сардэчна запрашаемі». Гэта сатырычная камедыя, у якой дасціпна, весела расказваецца пра дзяцей, але аўтар гісторыі, якая разгортваецца ў піянерскім лагеры, здолеў сілу свайго сатырычнага ўдару скіраваць на дарослых — перастрахоўшчыкаў і бюракратаў. У аўтараў фільма ёсць уменне не толькі канстатаваць, але і наступаць, змагацца. І гэта вельмі важна, гэта робіць карціну баяздольнай.

У патоку работ маладых ёсць і рамантычны струмень. Мне хочацца назваць фільм рэжысёраў Б. Грыгор'ева і Ю. Швырова «Першы снег». Яго аўтары апавядаюць пра моладзь перадваенных гадоў, імкнуцца паказаць выпрабаванне малодога пакалення вайною. Трошкі цяжкаватая форма апавядання можа збянтэжыць некаторых, але гэта ідзе ад жадання разабрацца ва ўсіх складаных пытаннях жыцця. Яны знаходзяць сваю паэтычную крыніцу, якая жывіць як сэнс, так і вобразнае вырашэнне твора. Карціна, як мне здаецца, атрымалася вельмі рэвалюцыйнай па сваім духу.

Павучальны поспех маладога рэжысёра-дэбютанта В. Шукшына. Сваім фільмам «Жыве такі хлопец» ён адраджае традыцыі аўтарскага кінематографа, на шляху якога ў нас было нямала значных перамог. В. Шукшын—пісьменнік, акцёр, рэжысёр—арганічна спалучае ў сабе ўсе бакі творчасці мастака, а гэта бывае не так часта. Гэта залежыць ад індывідуальнасці чалавека. Калі ён не пустая пасудзіна, дык перамагае сіла вострай і натуральнай назіральнасці, жаданне і ўменне прасачыць жыццё чалавечае ва ўсёй яго непаўторнасці. Шукшын — цікавы чалавек, і карціна атрымалася цікавая, з героем не сярэднеарыфметычным, а выхапленым з жыцця, у нечым вельмі асаблівым, нават выключным.

Л. Шапіцька зрабіла фільм «Спякота» па творы Ч. Айтматава «Вярблюджае вока». Яго тэма — барацьба старога і новага, вечная барацьба — новае неперадольна наступае, старое супраціўляецца. І зноў гэта паказана не ў абстрактных, не ў дэкларацыйных формах, хоць падобная праблема не раз ужо ставілася і не раз вырашалася ў мастацтве.

Уменне знайсці канкрэтнае, бачыць факт, давяраць яму, вывучаць яго, а не навешваць паспешлівы ярлык — усё гэта характэрна для маладых мастакоў.

Страсць пасцігаць прадмет, на мой погляд, ёсць адзіная страсць, вартая мастака.

«Спаборніцтва» — першая самастойная работа рэжысёра Б. Мансурава. Ён пачынаў яе як вучнёўскую яшчэ на чацвёртым курсе інстытута, але ўжо ў працэсе здымак стала ясна, што карціна выходзіць за рамкі курсавога задання, і яму дазволілі рабіць поўнаметражную карціну. У гэтым была зацікаўлена і студыя «Туркменфільм», дзе яна стваралася. На аглядзе фільмаў студый Сярэдняй Азіі «Спаборніцтва» ўдастоена першай прэміі.

Несправядліва было б не ўспомніць і пра цэлую групу маладых рэжысёраў, якія паспяхова працуюць на студыі «Грузіяфільм». Гэта вельмі таленавітыя браты Э. і Г. Шэнгелая. Сапраўдныя працаўнікі. Першы з іх у садружнасці з Т. Меліява паставіў цікавы фільм «Белы караван», вельмі паспяхова прабуе свае сілы ў рэжысуры і Г. Шэнгелая.

Кожны год «Грузіяфільм» папаўняецца новымі талентамі. Зусім нядаўна ва Усесаюзным інстытуце кінематаграфіі адбылася абарона дыпломаў яшчэ чатырох маладых грузінскіх рэжысёраў. М. Кабахідзе паказаў вельмі смешную камедыю «Вяселле». Названы вышэй Г. Шэнгелая экранізаваў твор грузінскага класіка М. Джавахішвілі «Узнагарода». О. Іаселіяні ў дакументальным фільме «Чыгун» здзівіў нас паэтычнасцю свайго мыслення—выразнымі сродкамі кінематографа ён будуе фільм, як верш. І, нарэшце, навукова-папулярная карціна рэжысёра З. Какабадзе «Слова лечыцца», якая прысвечана лячэнню ўнушэннем і выканана вельмі цікава. Чатыры розныя фільмы, чатыры розныя маладыя мастакі.

Нельга не парадавацца поспехам маладых. Іх удачы не выпадковая з'ява ў новым разбегу савецкага кінемастацтва. Яны — натуральны вынік імкнення глыбока задумацца над тым, што хвалюе маладыя розумы. Вынік шчырага імкнення пазнаць жыццё свайго героя і выказаць яго рэалістычна, з вычарпальнай паўнатой.

Сяргей ГЕРАСІМАЎ,
народны артыст СССР.

СІМФОНІЯ АБ МІРЫ І ВАЙНЕ

Маскоўскі кампазітар Радзіён Шчадрын — аўтар балета «Канёк-гарбунок», оперы «Не толькі каханне» і іншых твораў — прадставіў у нядзелю, 11 красавіка, на суд слухачоў сваю другую сімфонію.

Новы твор савецкага музыканта прысвечаны тэме міру і вайны. На гэта ўказвае эпіграф да сімфоніі, узяты з верша А. Твардоўскага «У той дзень, калі скончылася вайна». Па прызнанню аўтара, ён задумаў раскрыць тэму свайго твора праз гукавыя вобразы, якія акружаюць чалавека ў яго штодзённым жыцці.

Сімфонія складаецца з 25 прэлюдый, аб'яднаных у пяць буйных частак. У яе яркім пафасным фінале гучыць палымяны заклік адстаяць мір на зямлі.

ТАСС.

Па той бок

ТРУБАДУРЫ РЭВАНШУ

Не так даўно тэлегледачы Кёльна былі здзіўлены паяўленнем на экранах тэлевізараў забытых ужо асоб. Літаратурныя свяцілы трэцяга райха—празаік Эрвін Дзвінгер, паэт Герхард Шуман, драматург Эбергард Мёлер—з задавальненнем расказвалі пра свае літаратурныя шляхі, зусім не саромеючыся цёмнага мінулага — супрацоўніцтва з фашыстамі. Наадварот, лідэры літаратуры гітлераўскай Германіі стараліся сканцэнтраваць увагу тэлегледачоў на сваіх заслугах перад райхам.

Прэса з усмешкай аднеслася да выступлення фашысцкіх асаў ад літаратуры, лічачы яго проста камічным і выпадковым. «Сумніцельна было чакаць, — пісала «Цайт», — што яны змянілі свой светапогляд» і таму, дадавала газета, лепш за ўсё іх... не чапаць.

Выступленне славутых фашысцкіх пісьменнікаў было, аднак, не выпадковым. Яно яшчэ раз сведчыць пра добра арганізаваную ў ФРГ прапаганду нацыянал-сацыялізма. Найбольш служыць ёй праварадыкальная літаратура і публіцыстыка, вытрыманая ў мілітарысцкіх і нацысцкіх тонах. Роля гэтай духоўнай сілы ў Заходняй Германіі ўсё ўзрастае. Вось лічбы статыстыкі, якую публікуюць самі федэральныя ўлады.

Бюлетэнь міністэрства ўнутраных спраў у раздзеле «Паведамленні аб назіранні і пераадоленні праварадыкальных і антысемітскіх тэндэнцый» паведамляе, што ў 1961 г. ў ФРГ выходзіла 46 газет праварадыкальнага зместу тыражом у 160 тысяч экземпляраў (г. зн. на 30 тысяч больш, чым у 1959 г.), а ў 1962 годзе іх тыраж павялічыўся ўжо да 192 тысяч, а ліх экстрэмісцкіх арганізацый узрос да 112 супраць 86 у 1961 годзе.

Але гэтыя лічбы, на думку ўрада, толькі пацвярджаюць... мізэрную ролю экстрэмісцкіх арганізацый і іх друкаваных органаў.

Што ж такое «праварадыкалізм»? Прагрэсіўныя заходнегерманскія журналісты ўпэўнены, што гэта не што іншае, як дрэнна прыхаваны фашызм, які адкрыта заахвочваецца дзяржавай. Праварадыкальны друк усё смялей вядзе гаворку аб немінучай пераемнасці старых фашысцкіх традыцый для новых пакаленняў пасляваеннай Германіі. «Але паспрабуйце асудзіць нас,—усклікваюць прапаведнікі нацызму,—няма за што—мы не абаранялі райх у 1945 годзе».

Вядома, бязглузда абвінавачваць у фашысцкім мінулым тых, хто нарадзіўся ў 1933 годзе. Доктар Герхард Фрэй, рэдактар «Дойчэн нацыянал-цайтунг», якая ўсё больш ператвараецца ў цэнтральны орган правага радыкалізму, ведае гэта і не забывае падкрэсліць, што ў гітлераўскія часы ён быў яшчэ дзіцём. Нібыта няма за што судзіць і Эбу Венаты, аднаго з выдаўцоў «Дойчэр студэнтэн-анцайгер». Але Эба атрымала ад свайго бацькі, вядомага фашыста, нацысцкае выхаванне, аб чым сведчыць прафашысцкі тон яе газеты. Вывад відавочны: фашызм мае нашчадкаў, выхаваных пасля сорак пятага года.

Выклікае трывогу і культ салдата на старонках праварадыкальнага друку. Пад лозунгам «няшчасных ахвяр абароны краіны» адраджаюцца самыя горшыя мілітарысцкія традыцыі. Існаванне сотень мілітарысцкіх саюзаў для прапаганды салдацкіх і рэваншысцкіх традыцый гэты друк лічыць звычайнай справай, дазволенай федэральнай дэмакратыяй.

Сцвярджаючы, што правы радыкалізм не мае ў краіне значэння, той жа ўрадавы бюлетэнь успамінае пра «крытыку, якая вядзецца сіламі, што абараняюць дзяржаву». Сапраўды, дыскусіі і пратэсты супраць адраджэння фашызму не сціхаюць. Але чаго ж яны дасягнулі? Час ад часу забараняюцца нейкія кніжкі, а выдавец ці аўтар караюцца. Але якія гэта пакаранні, калі іх учыняюць былыя фашысты, што цяпер засеялі ў дзяржаўным апараце.

Нядаўна ў Франкфурце-на-Майне выйшла вельмі цікавая кніга прагрэсіўнага журналіста Гейнца Брэдзігама «Неанацысцкая, мілітарысцкая нацыяналістычная літаратура і публіцыстыка ў Заходняй Германіі». Гэтая дакументальная публікацыя грунтуецца на яркім фактычным матэрыяле, абапіраецца на дэталёвы аналіз сучаснай прафашысцкай літаратуры і публіцыстыкі ў Федэральнай Рэспубліцы. Трэба сказаць, што кніга Брэдзігама трапіла ў цэль. Пакрыўджаныя прафашысцкія дзеячы ад літаратуры абурыліся. Заядлы фашыст Фрэйгер фон дэр Хейдт, які калісьці няўдала спрабаваў шантажыраваць «Шпігель», падаў на аўтара ў суд: яму не спадабаліся неабвержныя аргументы кнігі.

Цяпер усе праварадыкальныя газеты не на жарт устрывожаны: сусветная грамадская думка аб'явіла байкот намеру ўрада ФРГ спыніць праследаванні фашысцкіх злачынцаў. 12 лютага 1965 года ў газеце «Дойчэн нацыянал-цайтунг унд золдатэн-цайтунг» на відным месцы з'явіўся вялікі артыкул доктара Карла Сімакса. Можна было б не заўважыць гэты артыкул, калі б не выразны загаловак: «Шантаж на вечныя часы? Капітуляцыя перад сусветным яўрэйствам». І гэта праз дваццаць гадоў пасля паражэння фашызму! Такая рэакцыя праварадыкальнага друку на абурэнне сусветнай грамадскасці выклікана рашэннем бонскіх улад.

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што пад фігавым лістом правага радыкалізму, за шырокай спіною бонскіх правіцеляў цягнуцца ўгору парасткі самага махровага фашызму.

Э. ДУБІНСКІ,
аспірант АН БССР.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

20 красавіка

Першая праграма. 11.00 — «Памяць сэрца». Тэлевізійны фільм. 11.30—героі нашага часу. Дакументальны фільм «Зоркі на зямлі». 17.05 — праграма перадач. 17.10—«Зорачка». Тэлевізійны часопіс для малодшых школьнікаў. 17.40—«Правадыр, мыслілець, чалавек». Успаміны В. А. Карпінскага аб Ул. І. Леніне. 18.05—тэлевізійныя навіны. 18.25—да 20-годдзя перамогі над фашысцкай Германіяй. «Вайцы непакоранага горада». 19.00—«Юнацтва правадыра». Прэм'ера фільма Ульянаўскай студыі тэлебачання (М). 19.35—«Свет сёння» (М). 20.15—В. Чайкоўскі. «Балотныя агні». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Частка 2-я (М). 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00—«Вясна, вясна!». Лірычны канцэрт. 22.40 — хакей. ЦСКА — «Спартак» (у запісе) (М).

Другая праграма. 17.00—праграма перадач (М). 17.10—для школьнікаў. «Шлях да музыкі». Перадача з Ленінграда. 18.00—тэлевізійныя навіны (М). 18.20—«Сельская навіна» (М). 19.00—«Выбаргская старана». Мастацкі фільм. 21.00—да 20-годдзя падпісання Дагавору аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Савецкім Саюзам і Польскай Народнай Рэспублікай. 21.30—тэлевізійныя навіны (М). 22.00—«Да вяршыняў майстэрства». Перадача з Вільнюса.

21 красавіка.

Першая праграма. 11.00 — «Выбаргская старана». Мастацкі фільм. 16.35—праграма перадач. 16.40—для школьнікаў. «Калі жывуць старонкі...» Г. М. Кржыжаноўскі аб Леніне (М). 17.10—для малодшых школьнікаў. «Свеціць зорачка». Перадача з Дома дзіцячай кнігі (М). 17.40—рашэнні сакавіцкага Пленума ЦК КПСС—у жыццё. «У добры час, сейбіт!» Выступленне сакратара ЦК ЛКСМ Беларусі М. І. Ржанава. 18.00—«Прысяга Ільічу». Прэм'ера тэлевізійнага фільма (М). 18.30—першынство СССР па футболу. «Дынамо» (Кіеў)—ЦСКА. Перадача з Кіева. У перапынку—тэлевізійныя навіны. 20.15—тэлевізійныя навіны (М). 20.30—«Тут кожны камень Леніна ведае» (М). 20.50—«Тры вясны Леніна». Прэм'ера хранікальна - дакументальнага фільма (М). 22.00—«У эфіры—«Маладосць» (М).

Другая праграма. 17.40—тэлевізійныя навіны (М). 18.00—«Раячыся з Ленінымі». Дакументальны фільм. 18.40—«Імем рэвалюцыі». Мастацкі фільм. 20.00—«Слова пра Леніна». Кінакампазіцыя.

22 красавіка

Першая праграма. 16.00 — праграма перадач. 16.05—для школьнікаў. «Ленін з намі. Ленін побач». 16.40—тэлевізійныя навіны. 17.00 — урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 95-годдзю з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Перадача з Крамлёўскага Палаца з'ездаў (М). Пасля заканчэння—тэлевізійныя навіны (М). 21.00—аб лаўрэатах Ленінскай прэміі 1965 года з галіне літаратуры і мастацтва (М).

Другая праграма. 15.25—праграма перадач (М). 15.30—для школьнікаў. «Імем рэвалюцыі». Мастацкі фільм (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці пісьменніка Палітыкі Дмітрыя Антонавіча і выказвае спачуванне сям'і, родным і блізкім нябожчыка.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 06551